Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

23 САКАВІКА 2007 г. ПЯТНІЦА

№ 55 (25920)

Кошт 400 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Рэпартаж з колаў

«ТОЕ, ШТО РОБІЦЬ «ЗВЯЗДА», — ПРАВІЛЬНА, СЛУШНА, ГРАМАТНА»

У зале пасяджэнняў Івянецкага пасялковага выканкама яблыку не было дзе ўпасці. Каб рассадзіць усіх ахвотнікаў прысутнічаць на сустрэчы са звяздоўскімі журналістамі, давялося ставіць прыстаўныя крэслы. Аднак усё роўна некалькі чалавек, хто крыху спазніўся, усё мерапрыемства ціхенька прастаялі ля адчыненых дзвярэй. І што асабліва прыемна — дабылі да самага канца нашага агітвыступлення, ніхто не збег раней.

Падчас сваіх «падпісных» вандровак дэсанту «Звязды» даводзіцца выступаць перад рознымі аўдыторыямі: бывае, на сустрэчу прыходзіць 5—10 чалавек, бывае — 300—400. Аднак незалежна ад колькасці прысутных далёка не заўсёды нам выпадае працаваць у такой кантактнай і добразычлівай аўдыторыі, як у Івянцы. Добрым словам хочацца ўспомніць «сустракаючы бок»: старшыню пасялковага выканкама Юрыя Шарыя, начальніка Валожынскага РВПС Зігмунда Лужынскага, галоўнага спецыяліста аддзела ідэалагічнай работы Валожынскага райвыканкама Яну Сіняўскую, якія дапамаглі арганізаваць у Івянцы Дзень падпісчыка «Звязды» і прынялі самы непасрэдны ўдзел у самой сустрэчы з падпісчыкамі.

А першым, хто прыйшоў паглядзець на тых, чые матэрыялы рэгулярна чытае, быў даўні прыхільнік газеты, жыхар вёскі Кульшычы пенсіянер Станіслаў Казіміравіч Паплаўскі. Пяць кіламетраў, якія аддзяляюць яго вёску ад Івянца, ён адужаў на веласіпедзе. Жыве ён разам з жонкай, пенсію мае сціплую: «У мяне 150 тысяч атрымліваецца, — прызнаўся наш чытач, — а трэба ж і хлеба купіць, і да хлеба. Таму на кварта-

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Спачатку адбылося ўрачыстае ўручэнне пашпарта халадзільніка «Атлант» (наш чытач Станіслаў ЦІС атрымаў гэты дакумент з рук намесніка старшыні Гродзенскага гарвыканкама Валянціна ЛЯВОНАВА), а праз гадзіну супрацоўнікі «Звязды» дапамаглі гаспадару даставіць выйгрыш да дома.

тал выпісваць газету не магу, толькі на месяц. Паштальёнка мяне ўжо добра ведае. Я ёй кажу — нават калі мяне дома не застанеш, падпішам на «Звязду» смела». Найбольш цікавяць у газеце Станіслава Казіміравіча крымінальная хроніка і парады «Хатняй энцыклапедыі». Аднак, карыстаючыся выпадкам, чытач наракаў, што не вельмі зручна ў нас друкуецца праграма тэлебачання — часам яна «разбаўляецца» творчымі матэрыяламі, займае дзве старонкі. Дзякуй за слушную заўвагу. Будзем намагацца рабіць праграму больш кампактнай.

Яшчэ адзін наш чытач і падпісчык з 20-гадовым стажам былы дырэктар мясцовай школы Віктар Паўлавіч Казерскі падзякаваў нам за захаванне роднай мовы, пахваліў за наваўвядзенні ў афармленні і вёрстцы газеты. «Аднак галоўнае, што мне падабаецца ў «Звязде», гэта змест, — адзначыў Віктар Паўлавіч. — На яе старонках ёсць і агляд палітычных падзей, і эканамічная інфармацыя, і парады па гаспадарцы. Я жыву з верай, што і заўтра, і праз дзень прачытаю ў нашай газеце нешта цікавае і карыснае для сябе». Сярод прысутных на сустрэчы з журналістамі была і наша пастаянная аўтарка, былая настаўніца, а цяпер пенсіянерка з вёскі Урублеўшчына Наталля Сямёнаўна Капуста. Яе творы часам з'яўляюцца ў нашай рубрыцы «Алё, народ на провадзе!» Як творчая натура і адданая прыхільніца «Звязды», Наталля Сямёнаўна не магла прыйсці на сустрэчу з журналістамі з пустымі рукамі. Яна прынесла падарунак — прыпеўку, якую мы з задавальненнем тут прыводзім:

Муж пачаў чытаць раёнку —
Перастаў піць самагонку.
А калі «Звязду» адужаў —
Ідэальным
стаў ён мужам!

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сёння — Сусветны дзень метэаралогіі

ХТО АДКАЗНЫ ЗА НАДВОР'Е?

Метэаралагічная станцыя ў Полацку — старэйшая не толькі на Віцебшчыне, але і, бадай, на Беларусі, ёй — 120 гадоў. Сёння ў невялікім будынку станцыі разам працуюць групы метэаролагаў і гідролагаў. Яны вядуць кругласутачныя назіранні за станам надвор'я, глебы, лічаць сток вады ў рэках басейна Заходняй Дзвіны і некалькіх буйных азёрах. Адсочваюць тэмпературныя рэжымы, рыхтуюць штогадовыя справаздачы гідра- і метэапаказанняў. Дзякуючы супрацоўнікам такіх жа беларускіх станцый, кожны пражыты дзень краіны абавязкова застанецца ў гісторыі — у лічбах і знаках, за якімі — багаты вопыт у пазнанні навакольнага асяроддзя, патрэбныя ўсім нам прагнозы надвор'я.

На здымку: гідролагі Таццяна ВАШЧАНКА, Анжэліна КУЗЬМІЧОНАК і Алена ЯСКЕВІЧ.

Урад Расіі адобрыў падпісанне пагаднення з Беларуссю аб пастаўках цукру

Урад Расіі адобрыў падпісанне пагаднення з Беларуссю аб пастаўках цукру. У адпаведнасці з распараджэннем прэм'ер-міністра РФ Міхаіла Фрадкова пагадненне даручана падпісаць Міністэрству сельскай гаспадаркі, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе расійскага Кабінета Міністраў.

Праект дакумента ўзгоднены з зацікаўленымі федэральнымі органамі выканаўчай улады Расіі і папярэдне прапрацаваны з беларускім бокам. Нагадаем, што ў студзені беларускі і расійскі бакі парафіравалі пагадненне, паводле якога Беларусь уводзіць самаабмежаванне на пастаўкі белага цукру на расійскі рынак: у гэтым годзе пастаўкі павінны скласці 180 тыс. тон, у 2008 — 100 тыс. тон. У адпаведнасці з пагадненнем значна

ЧАС — УПЕРАД!

Як паведамілі «Звяздзе» ў Міжведамаснай камісіі па часу і эталонных частотах Рэспублікі Беларусь, 25 сакавіка 2007 года ў адпаведнасці з парадкам вылічэння часу на тэрыторыі краіны будзе здзейснены пераход на «летні» час. Такім чынам, 25 сакавіка ў 2 гадзіны ночы стрэлкі гадзінніка пераводзяцца на адну гадзіну ўперад.

Эканомім электраэнергіі на 3 мільёны долараў

Перавод на летні час мае сваёй мэтай найперш эканомію энергарэсурсаў. Пра якія лічбы можа ісці гаворка? Гэта пытанне мы адрасавалі галоўнаму інжынеру — галоўнаму дыспетчару аператыўна-дыспетчарскага ўпраўлення энергасістэмай Рэспублікі Беларусь Віталю Кушнярову.

— З пераходам на летні час гадавое зніжэнне электраспажывання складае 0,25—0,3 працэнта ад гадавога электраспажывання, — адказаў суразмоўца. — Абсалютная эканомія электраэнергіі складае каля 90 мільёнаў кВт/гадз. Для параўнання: гэта адпавядае сутачнаму электраспажыванню ўсёй краіны ў выхадны дзень у сакавіку, іншымі словамі, за год эканомяцца цэлыя суткі. Калі перавесці гэтую лічбу — 90 мільёнаў кВт/гадз — у паліва, што патрэбна для выпрацоўкі такой колькасці электраэнергіі, атрымаецца каля 25 мільёнаў кубаметраў газу. У сваю чаргу эканомія такой колькасці паліва, калі браць у цэнах сённяшняга дня, складзе каля 3 мільёнаў долараў. Заўважу, што ўсе вышэйназваныя лічбы датычацца толькі электраспажывання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

А на мой погляд...

«Вясковец гатовы ісці на працу яшчэ раней. Абы ўвечары светлавы час на гаспадарку быў»

25 сакавіка ў дзве гадзіны мы будзем пераводзіць стрэлкі гадзіннікаў на адну гадзіну наперад. Як звычайна, у большасці сем'яў напярэдадні будзе гучаць напамін адзін аднаму, маўляў, толькі б не забыцца (асабліва калі на раніцу плануюцца нейкія паездкі ці сустрэчы), а паралельна — і чарговае абмеркаванне плюсоў або мінусаў ад такога кроку як для саміх грамадзян, так і для ўсёй эканомікі.

Ці ўплывае на ваша самаадчуванне, настрой, працаздольнасць перавод стрэлак гадзінніка (уперад або назад)? Якім чынам вы мінімізуеце магчымыя наступствы ў такіх выпадках?

Наталля ЖЫВАЛЕЎСКАЯ, старшы інспектар цэнтра прапаганды і навучання пры ўстанове «Гродзенскае абласное ўпраўленне МНС»:

— Нічога не прадпрымаю, нічога не адчуваю. Мая праца звязана з тым, што часам даводзіцца ўставаць і ў 5, і ў 6 гадзін раніцы. Не, ніякіх надзвычайных здарэнняў, гэта звязана з планавай работай, калі, напрыклад, трэба падрыхтавацца да сустрэчы. Думаю, што і ў большасці маіх калег такіх праблем таксама няма.

Наталля АФАНАСЬЕВА, эканаміст Мінскай дзяржаўнай лесагаспадарчай установы:

— Перавод стрэлак на гадзінніку што ўперад, што назад ніякім чынам на маім самаадчуванні, настроі не адбіваецца. Наадварот, зараз дзень будзе пачынацца раней, уставаць лягчэй будзе, бо ўжо зусім светла стане... А ўвогуле я «жаваранак», таму ніякіх дадатковых намаганняў, каб добра сябе адчуваць, мне не трэба.

Анатоль ЧАЙКОЎСКІ, загадчык фермы СВК «Шчорсы» Навагрудскага раёна:

— Сказваецца гэты перавод, як кажуць, на ўсе 100 працэнтаў. Вельмі цяжка людзям недзе з месяц — пакуль арганізм не адаптуецца. Мы ж прызвычаіліся рабіць усё ў пэўны час, а тут трэба «ламаць» сябе. Вось глядзіце: уставаць трэба ўжо не ў 6 гадзін раніцы, а ў 5 — каб справы па ўласнай гаспадарцы парабіць. Праз гадзіну — на ферму, разам з даяркамі падрыхтавацца да ранішняй дойкі, яшчэ праз гадзіну ўласна сама дойка пачынаецца. Ды і ўвечары, калі рагулі на пашы, да апоўначы даводзіцца працаваць. Таму гэтая гадзіна як нажом па сэрцы, скажу шчыра. Дарэчы, пакутуюць не толькі людзі, але і каровы. Рагулі, праўда, адаптуюцца да новых умоў значна хутчэй — недзе за тыдзень.

Васіль ЛІХАЧЭЎСКІ, начальнік каардынацыі і кантролю дэпартамента па каштоўных паперах Міністэрства фінансаў:

— Ведаеце, напэўна, з-за таго, што арганізм малады, асабліва я ніякіх значных наступстваў ад пераводу стрэлак наперад або назад не адчуваю. Хіба толькі першыя два-тры дні адчуваецца нібыта санлівасць. Па ўнутранаму біялагічнаму гадзінніку кладзешся спаць як звычайна, а ўставаць па рэальнаму гадзінніку даводзіцца раней. Але на працаздольнасць, настрой гэта не ўплывае. Часам бывае, зноў жа па маладосці (смяецца), і палову ночы не спіш — і нічога.

Чэслаў ЖЫДАЛОВІЧ, дырэктар Валожынскіх электрасетак:

— Можна я раскажу вам свой распарадак дня? У 5 гадзін раніцы еду ў падшэфную гаспадарку, да 9 гадзін вяртаюся на сваё асноўнае месца працы. Пасля заканчэння працоўнага дня — з 21 да 23 гадзін — планёрка ў выканкаме. Дадому вяртаюся ў 24 гадзіны, паспаў 4 гадзіны — і зноў усё спачатку. А ўвогуле, што сказаць яшчэ? Мы, я маю на ўвазе вяскоўцаў, гатовы ісці на працу яшчэ раней, але і вяртацца раней дадому. Больш светлавога дня — больш магчымасцяў парабіць справы па ўласнай гаспадарцы.

Людміла ПЕТРАКОЎСКАЯ, начальнік управлення арганізацыі гандлю Міністэрства гандлю:

— Часу не хапае штодзень. Вельмі шмат працы — іду да 8 гадзін раніцы, вяртаюся дадому ў 21 гадзіну вечара. Таму «недасып» пастаянны. Як вы думаеце, ці пайплывае на самаадчуванне перавод стрэлак гадзінніка ўперад або назад? Прадпрымаць нешта ў гэтай сувязі, як вы кажаце, таксама няма часу.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Нашчадкі вогненных вёсак

ХАТЫНЬ — ТРАГІЧНЫ СІМВАЛ БЕЛАРУСІ

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Учора ў Хатыні прайшоў мітынг-рэквіем, прысвечаны памяці жыхароў гэтай беларускай вёскі, якія зажыва былі спалены 22 сакавіка 1943 года.

Пасля мітынгу адбылося афіцыйнае адкрыццё экспазіцыі «Нашчадкі вогненных вёсак» па выніках двух этапаў сумеснай акцыі рэдакцыі газеты «Звязда» і Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь». У ім бралі ўдзел сведкі трагедыі Хатыні, якім пашчасціла выжыць, — Соф'я Фіохіна і Віктар Жалабковіч. Уладзімір Яскевіч зараз хварэе, яго прадстаўляў праўнук Цімафей разам са сваёй прабабкай Людмілай Антонаўнай. Знішчаную і адноўленую вёску Боркі Вілейскага раёна прадстаўляла Фаіна Анасовіч з дачкой Таццянай (шчыры дзякуй вілейскім уладам за транспартную дапамогу!). Вёску Літвічы Лагойскага раёна прадстаўляў Уладзімір Жа-

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

варанак, вёску Прудкі — Ганна Ліс і Леаніда Шуляк. Іншыя не змаглі прыехаць па стану здароўя. Упершыню не было ў гэты дзень Мікалая Гірыловіча, ён нядаўна пайшоў з жыцця. На магілу Дальвы, што на Могілках спаленых вёсак, кветкі паклала яго ўдава Рыма Ігараўна Гірыловіч...

Больш падрабязна аб гэтай падзеі чытайце ў адным з бліжэйшых нумароў «Звязды».

Таццяна ПАДАЛЯК.

БЕЛАРУСБАНК

АСБ «Беларусбанк» информирует, что с 26 марта 2007 года начинает прием денежных средств на новый срочный банковский вклад в белорусских рублях

«УДОБНЫЙ»

Срок хранения вклада — 25 дней.
Фиксированная ставка — 14,5% годовых.
Минимальная сумма для открытия вклада — 100000 рублей.

Особые условия вклада **«Удобный»:**

-Вклад может быть открыт на имя другого лица.
-Без права пополнения вклада.
-При неистребовании вклада по истечении срока хранения он автоматически переоформляется на новый срок, аналогичный первоначальному.

Будем рады видеть Вас клиентами АСБ «Беларусбанк».
Дополнительную информацию можно получить в любом отделении АСБ «Беларусбанк» или на веб-сайте банка http://www.belarus-bank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь

УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона)

проводит открытый аукцион по продаже конфискованной в доход государства однокомнатной квартиры, общей площадью 33,18 кв.м, расположенной по адресу: г. Минск, ул. Первомайская, дом 22, корпус 1, квартира 12. Взыскание на имущество обращено приговором суда Октябрьского района г. Минска от 25.08.2006 и определением суда Партизанского района г. Минска от 15.11.2006. Начальная цена составляет 126 378 000 рублей. Задаток в размере 10 000 000 рублей перечисляется на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Оплата за объект производится в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится 24 апреля 2007 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 23 апреля 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

ТЕЛЕФОН ДЛЯ СПРАВОК: (8-017) 227-40-22.
ИНТЕРНЕТ: WWW.MGCN.BY.

белагропромбанк
традиции будущего

УТВЕРЖДЕНО:
Решение Финансового комитета ОАО «Белагропромбанк» от 21.03.2007 № 24

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК» с 26 марта 2007 г.

Сумма депозита, ед. валюты	Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками % годовых							Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками % годовых					
	Срок, дни							Срок, дни					
	100	200	300	500	1 000	2 000	3 000	100	200	300	500	1 000	2 000
Белорусские рубли													
1 – 1 000 000	10,50	11,50	13,00	14,50	15,00	15,50	16,00	8,50	8,80	9,10	9,40	9,70	10,00
1 000 001 – 10 000 000	11,00	12,00	13,50	14,75	15,25	15,75	16,25	8,60	8,90	9,20	9,50	9,80	10,25
10 000 001 и более	11,50	12,50	14,00	15,00	15,50	16,00	16,50	8,70	9,00	9,30	9,60	9,90	10,50
Доллары США													
1 – 500	5,00	6,00	7,50	8,50	9,00	9,50	10,00	4,50	5,50	7,00	7,50	8,00	8,50
501 – 5 000	5,50	6,50	8,00	8,75	9,25	9,75	10,25	5,00	6,00	7,25	7,75	8,25	8,70
5 001 и более	6,00	7,00	8,50	9,00	9,50	10,00	10,50	5,50	6,50	7,50	8,00	8,50	9,00
Евро													
1 – 500	5,00	6,00	7,50	8,50	9,00	9,50	10,00	4,50	5,50	7,00	7,50	8,00	8,50
501 – 5 000	5,50	6,50	8,00	8,75	9,25	9,75	10,25	5,00	6,00	7,25	7,75	8,25	8,70
5 001 и более	6,00	7,00	8,50	9,00	9,50	10,00	10,50	5,50	6,50	7,50	8,00	8,50	9,00
Российские рубли													
1 – 15 000	5,00	6,00	7,00	8,00	9,00	10,00	10,50	5,00	5,50	6,00	6,50	7,00	8,00
15 001 – 150 000	5,50	6,50	7,50	8,50	9,50	10,25	10,75	5,25	5,75	6,25	6,75	7,50	8,50
150 001 и более	6,00	7,00	8,00	9,00	10,00	10,50	11,00	5,50	6,00	6,50	7,00	8,00	9,00

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 г. № 2.

ВІКТАР ШЭЙМАН І ПРЭЗІДЭНТ ВЕНЕСУЭЛЫ АБМЕРКАВАЛІ ПЫТАННІ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў ЭНЕРГЕТЫЦЫ І БУДАЎНІЦТВЕ

Актуальныя пытанні развіцця двухбаковага супрацоўніцтва былі абмеркаваны ў час сустрэчы Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі, сустаршыні беларуска-венесуэльскай сумеснай камісіі высокага ўзроўню Віктара Шэймана з прэзідэнтам Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавесам. Перагаворы адбыліся ў Каракасе. Віктар Шэйман узначальвае ўрадавую дэлегацыю Беларусі, візіт якой у Венесуэлу прадоўжыцца па 25 сакавіка.

У цэнтры ўвагі на перагаворах былі пытанні рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых у ходзе сустрэчы кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі і прэзідэнта Венесуэлы Уга Чавеса ў ліпені мінулага года ў Мінску. У прыватнасці, гэта датычыцца энергетычнай сферы, сельскай гаспадаркі, прамысловасці. У ходзе сустрэчы абмяркоўвалася праграма супрацоўніцтва ў газіфікацыі венесуэльскіх гарадоў, будаўніцтва завода па абагачэнню фасфату, а таксама стварэнне сумеснага прадпрыемства па зборцы трактароў і грузавікоў.

БЕЛТА.

РАСКРЫТА ЗАБОЙСТВА РАСІЯНІНА...

Крыху больш за тыдзень спатрэбілася супрацоўнікам беларускай міліцыі, каб высветліць акалічнасці гібелі мужчыны, які быў знойдзены на беразе ракі Днепр у Аршанскім раёне. Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, з пачатку следства відавочным фактам было толькі тое, што няшчасны стаў ахвярай невядомых крымінальнікаў. У выніку напружанай і карпатлівай працы ўдалося ўстанавіць асобу ахвяры: ім аказаўся 32-гадовы жыхар Санкт-Пецярбурга. Як высветлілася, у жорсткай расправе над санкт-пецярбуржцам падазраецца... яго жонка. А дапамог ёй учыніць злачынства знаёмы, які раней быў судзімы за разбой.

Ігар ГРЫШЫН.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II КВАРТАЛ 2007 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Наступствы чарнобыльскай катастрофы

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ — газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых саветаў

СВАЯ СПРАВА — бізнес, эканоміка, фінансы

Жыві, Беларусь! — Наш культурны асяродак

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

КУПІ ЛЕПШАЕ! ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ

Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	7700 рублёў на месяц 23100 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	7450 рублёў на месяц 22350 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	11000 рублёў на месяц 33000 рублёў на квартал
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	10020 рублёў на месяц 30060 рублёў на квартал
ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» ПРАЗ «МІНГАРСАЮЗДРУК»	63850	6970 рублёў на месяц 20910 рублёў на квартал
	63145	6350 рублёў на месяц 19050 рублёў на квартал
	63858	7043 рублі на месяц 21129 рублёў на квартал

ISSN 1990-763X

9 771990 763015

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.03.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 143,00
1 еўра	2 864,87
1 латвійскі лат	4039,20
1 літоўскі літ	829,70
1 чэшская крона	102,38
1 польскі злоты	739,74
1 расійскі рубель	82,52
1 украінская грыўня	426,87

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	25,9709
10 UAH	51,3188
1000 BYR	12,0928
EUR	34,7309

Курс у гандлёвых кампаніях (на 22.03.2007 г.)

USD 2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Акцыя «За незалежную Беларусь!» стартуе

Рэспубліканская акцыя «За незалежную Беларусь!» пройдзе ў сакавіку—ліпені ў нашай краіне, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве культуры.

Яе мэтай з'яўляецца фарміраванне патрыятычных каштоўнасцяў, папулярызацыя маладзёжнага руху, прапаганда музычнай творчасці, здаровага ладу жыцця і заняткаў спортам. Ініцыятарамі гэтай акцыі сталі Міністэрства культуры і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.

Ва ўсіх раённых і абласных цэнтрах на стадыёнах і адкрытых пляцоўках пройдуць масавыя мерапрыемствы канцэртна-забаўляльнай і спартыўнай накіраванасці з удзелам артыстаў беларускай эстрады, вядучых спартсменаў і футбольных камандаў. А завершыцца акцыя ў Дзень незалежнасці на стадыёне «Дынама» гала-канцэртам майстроў мастацтваў і правядзеннем футбольнага матча з удзелам нацыянальнай зборнай Беларусі па футболу.

Як стартавае мерапрыемства акцыі «За незалежную Беларусь!» у Мінску 25 сакавіка адбудзецца маладзёжны музычны фестываль, арганізаваны Міністэрствам культуры, Мінскім гарвыканкамам сумесна з Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі.

Фестываль, у якім прымуць удзел вядучыя беларускія артысты, пачнецца ў 11.00 адначасова на дзвюх імправізаваных канцэртных пляцоўках: на тэрыторыі аэрапорта «Мінск-1» і каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Перад гледачамі каля Нацыянальнай бібліятэкі на працягу шасці гадзін пройдзе канцэрт з удзелам Нацыянальнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры», Тэатра песні Ірыны Дарафеевай, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Якава Навуменкі, пераможцаў і прызёраў конкурсу песні «Еўрабачанне» Ксеніі Сітнік, Андрэя Кунца і выхаванцаў Нацыянальнага цэнтра музычнага мастацтва імя Уладзіміра Мулявіна, іншых папулярных беларускіх артыстаў.

У той жа час у аэрапорце «Мінск-1» выступяць Дзмітрый Калдун, Руслан Аляхно, Іна Афанасьева, Іскуі Абалян, Віктарыя Алешка, Ларыса Грыбалёва, Алена Грышанава, Ірына Дарафеева, Пётр Елфімаў, Жанет, Саша Нэма, Паліна Смолава, Юльяна, групы «Тяни-Толкай», «The Project», «Топлес» і многія іншыя папулярныя выканаўцы.

«Тое, што робіць «Звязда», — правільна...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На сустрэчы з журналістамі людзі прыходзяць не толькі каб паглядзець на «пішучыя пёры», падзякаваць ці пакрытыкаваць за творчасць. Да нас звяртаюцца і па дапамогу ў вырашэнні сваіх праблем. Так, былая настаўніца і даўняя наша падпісчыца Ганна Вацлавaўна Мірон прайшла пешшу 7 кіламетраў, і каб пахваліць газету, і каб заадно — паскардзіцца. «Прадавец нашага сельмага памерла, цяпер магазін зачынены, — расказала чытачка. — Да нас толькі аўталаўка заязджае. І купляеш там не тое, што хочаш, а тое, што ёсць. Да таго да нас у вёску не ходзіць аўтобус. Вёска крыху ўбаку ад дарогі, аднак аўтобус «Мінск—Рубяжэвічы» мог бы рабіць прыпынак і ў нас (там не больш за кіламетр аб'езду і дарога добрая)».

Будзем спадзявацца, што мясцовыя ўлады прачытаюць наш рэпартаж і пастараюцца прыняць неабходныя меры. Мы крыху пазней вернемся да праблем гэтай вёскі.

Падчас сустрэчы ў Івянцы выступалі многія нашы падпісчыкі — дзякуй усім за добрыя словы і за вернасць нашай газеце. Нам жа асабліва запомнілася выступленне Марыны Шырвель. Сама яна — хатняя гаспадыня, даглядае дваіх дзетак, у яе ёсць дзве сястры. «Звязду» заўсёды выпісвалі іх бацькі і любоў да газеты перадалі дочкам у спадчыну.

Спадзяёмся, сёстры выгадуюць нам новае пакаленне падпісчыкаў, прывучаць сваіх дзетак паважаць родную мову і самую старэйшую ў краіне газету. «Мне вельмі падабаецца як аператыўна і дакладна «Звязда» адказвае на пытанні чытачоў, — прызналася Марына. — Нашы мясцовыя чыноўнікі не заўсёды могуць даць поўнае тлумачэнне, а газета — дае. У «Звязду» звярталася мая сястра — з сур'ёзным складаным пытаннем, і ёй адразу ж адказалі. Потым я сама тэлефанавала — прыходзіць свежы нумар, а там ужо змешчаны адказ на маё пытанне. Гэта вельмі зручна. Дзякуй вам. Няхай «Звязда» прыходзіць у кожную хату!»

Развітанне з Івянцом было крыху сумным і — вельмі... салодкім. Сумным таму, што жыхары гарадскога пасёлка і навакольных вёсак кранулі нас сваёй шчырасцю і добразычлівасцю. А за салодкі ўспамін — дзякуй мясцоваму прадпрыемству «Івкон». Яго прадстаўнік аказаўся настолькі сціплым, што ціхенька прасядзеў усю сустрэчу, потым пачаставаў нас фірменнымі цукеркамі і сышоў, не пакінуўшы візітоўку і не назваўшы сваё імя. Таму мы дзякуем усяму прадпрыемству — за высакаякасную прадукцыю, за ўвагу да нашай газеты. Спадзяёмся, што сярод работнікаў «Івкона» таксама ёсць і будуць нашы падпісчыкі.

...Наўрад ці будзе памылкай сказаць, што больш за ўсіх прыезду звяздоўскага дэсанта ў Гродна чакалі два чалавекі — участковы педыятр Станіслаў Іосіфавіч Ціс і яго жонка Аліна Антонаўна. Людзям сапраўды пашчасціла — яны выйгралі звяздоўскі супер-прыз — халадзільнік «Атлант». Прыемна ўдвая, таму што ў гэтым месяцы ў Станіслава Іосіфавіча быў дзень нараджэння, да якога Фартуна вырашыла зрабіць такі каштоўны падарунак. Стары халадзільнік Станіслаў і Аліна набылі, як толькі пажаніліся (у 1989 годзе). І апошнім часам якраз падумвалі яго памяняць на новы, таму выйгрыш у «Звяздзе» аказаўся якраз дарэчы. «Са «Звяздой» я з 1987 года, — прызнаўся шчаслівчык. — Упершыню з ёй пазнаёміўся, калі адпрацоўваў інтэрнатуру ў Бабруйскай раённай бальніцы. Тады загадчыца дзіцячага аддзялення прынесла на працу свежы нумар з вельмі цікавымі матэрыяламі. Спачатку я набываў газету ў кіёсках, потым пачаў выпісваць. З той пары з ёй не расстаюся».

Асабліва ўдачлівым Станіслаў Іосіфавіч сябе не лічыць, хоць тры гады таму быў прызнаны лепшым педыятрам Гродзенскай вобласці і атрымаў у падарунак пральную машыну. Зараз — халадзільнік. «Застолося ў супер-лато машыну выйграць», — пажартавала Аліна Антонаўна.

На ўрачыстым уручэнні халадзільніка прысутнічалі намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама Валянцін Лявонаў, начальнік аддзела па ідэалагічнай працы гарвыканкама Сяргей Дубавец, дырэктар Гродзенскага філіяла РУП «Белпошта» Віктар Бутрым. Прыемна, што не толькі словам адказныя асобы падтрымалі нашу газету — падпісаліся на «Звязду», узялі ўдзел у віктарыне. «Праз беларускамоўныя сродкі масавай інфармацыі мы звяртаемся да нашых бацькоў, да сваіх каранёў, — адзначыў Валянцін Лявонаў. — І гэта добра. Па заявах бацькоў мы будзем адкрываць у горадзе беларускамоўныя класы».

— Я заўсёды падпісваюся на тыя перыядычныя выданні, якія ладзяць у нас свае прэзентацыі і сустрэчы з падпісчыкамі, — патлумачыў галоўны паштавік вобласці Віктар Францавіч Бутрым. — Тое, што робіць «Звязда», — правільна, слушна, граматна.

Валянціна ДОЎНАР, Інга МІНДАЛЁВА, Барыс ПРАКОПЧЫК.

ВЯРШЫНІ-TV.

ТРЭЦЯЕ ЎЗЫХОДЖАННЕ

Яшчэ да пачатку цырымоніі ўзнагароджання Трэцяга нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу «Тэлевяршыня» большасць членаў журы адзначыла дзве тэндэнцыі гэтага года: прыкметны рост прадукцыі рэгіянальных тэлекампаній і «вузкасць» некаторых намінацый для канкурсантаў. У сувязі з першым момантам журы заснавала свой спецпрыз «За творчы і прафесійны рост» — яго атрымала Лідскае тэлерадыёаб'яднанне, а з другім паабяцаў разабрацца сустаршыня журы, намеснік міністра інфармацыі Аляксандр Слабодчык.

На конкурс сёлета было прадстаўлена 248 работ, з іх 66 — ад Белтэлерадыёкампаніі, 21 — ад СТБ, 14 — ад АНТ. Усе астатнія — абсалютную большасць — прадставілі рэгіянальныя і недзяржаўныя тэлекампаніі. Спаборніцтва ішло ў 21 намінацыі — 13 датычыліся тэлепраектаў, 8 — тэлевізійных персаналій. Да 20 лютага адборачная камісія вызначала лепшыя праграмы, якія дапускаліся да ўдзелу ў конкурсе, потым прафесійнае журы тайным галасаваннем вызначала прыярытэты — такім чынам, упершыню за час існавання прэміі яе лаўрэаты не былі вядомыя загадзя. Інтрыга захоўвалася да ўрачыстага моманту раскрыцця канвертаў на сцэне Палаца Рэспублікі.

Гран-пры «Тэлевяршыні» атрымала ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» (АНТ) за правядзенне канцэртнага тура «За Беларусь!». Як адзначыў кіраўнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Алег Праляскоўскі, які ўручаў галоўную ўзнагароду конкурсу, «Тэлевершыня» дэманструе, што наша беларускае тэлебачанне імкліва развіваецца і паляпшаецца». З 60 намінантаў, якія прэтэндавалі на 20 асноўных узнагарод, усе былі адноллька годнымі і вартымі перамогі, так што задача для журы выдалася няпростай. Зрэшты, не менш складанай яна была і для арганізатараў — у гарачцы некалькі статуэтак нават былі пераблытаныя, але гэта не зменшыла радасных пачуццяў пераможцаў...

Лідарам сярод узнагароджаных стала Белтэлерадыёкампанія — 9 статуэтак. Першынство БТРК асабліва выразна было бачным у «персанальных намінацыях». Лепшымі вядучымі інфармацыйнай праграмы журы прызнала Віктарыю Сянкевіч і Ігара Кругліка, грамадска-палітычнай — Юрыя Гроерава, забаўляльнай — Святлану Бароўскую, спартыўнай — Паўла Булацкага. Лепшыя аператар і рэжысёр Беларусі, як высветлілася, таксама працуюць на БТРК. Акрамя таго, кампанія ўзяла «Тэлевяршыні» за лепшую спартыўную і публіцыстычную праграмы, а таксама за лепшы тэлевізійны дызайн — пакет графічнага афармлення канала «ЛАД».

Фота БЕЛТА.

У СТБ вынікі больш сціплыя, але ніколькі не менш годныя. Так, на канале ўзнагароды атрымалі: лепшы рэпарцёр — Ігар Пазняк, лепшая інфармацыйная праграма — «24 гадзіны», а таксама культурна-асветніцкая праграма — «Мінск і мінчане».

Канал АНТ першынстваваў у намінацыях «Лепшая грамадска-палітычная праграма» («Дыханне планеты»), «Лепшая музычна-забаўляльная-праграма» («Вечары ў Мірскім замку»), «Лепшы дакументальны фільм» («Савецкая Беларусія»).

Упершыню на цырымоніі была прадстаўлена намінацыя «Лепшы рэкламны ролік», у якой перамагла Беларуская асацыяцыя недзяржаўнага тэлебачання з ролікам «Карыда». Лепшай праграмай для дзяцей і юнацтва стаў тэлегід па прафесіях «Мар, дзейнічай, будзь!» МТРК «Мір», абышоўшы сапернікаў з Белтэлерадыёкампаніі і кампаніі «Брэст».

Рэгіёны былі прадстаўлены ў трох намінацыях — «Лепшая праграма навін рэгіянальнага тэлебачання», «Лепшы вядучы рэгіянальнага ТБ» і «Лепшы рэгіянальны ТБ-праект». Другі раз запар каралём рэгіянальных навін стала ТК «Ранак» з горада Светлагорска Гомельскай вобласці — з праграмай «Ранак-навіны». Лепшым вядучым аказаўся Андрэй Палаўчэня з Другога канала г. Магілёва. Праект тэлекампаніі «Брэст» «Карона Ліцвінскай імперыі» стаў лепшым рэгіянальным праектам-2006 **(на фота)**.

Акрамя таго, упершыню за тры гады ў «Тэлевяршыні» — нават ва ўсяго беларускага тэлебачання — з'явіўся ўласны гімн. Нагадаем, поўную версію «Тэлевяршыні» канал СТБ пакажа сёння ўвечары.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

*Віншуем паважаную **Любоў Мікалаеўну ПРАКАПОВІЧ,** намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце Пагосцкай СШ з юбілеем. Шчыра жадаем моцнага здароўя, поспехаў у працы, дабрабыту і радасці ў жыцці.*

Сябры, калегі.

Адраджэнне вёскі

Кадры для сяла: высокі ўзровень ведаў у абмен на добрыя ўмовы жыцця і працы

22—23 сакавіка ў Горках праходзіць выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны па аграрных пытаннях. Парламентарыі разам з кіраўніцтвам і выкладчыкамі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі абмяркоўваюць стан і перспектывы падрыхтоўкі прафесійных кадраў для сельскай гаспадаркі краіны.

Удасканаленне навучання спецыялістаў сельскай гаспадаркі дыктуюць сённяшнія рэаліі і Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гады. У земляробстве і жывёлагадоўлі ўкараняюцца новыя тэхналогіі, сучасныя трактары і камбайны — гэта складаная і начыненая электронікай тэхніка, і таму працаўнікі сельскай гаспадаркі павінны мець больш высокі ўзровень ведаў.

Выязное пасяджэнне камісіі невыпадкова праходзіць у Горацкім раёне. Сельская гаспадарка тут поўнасцю забяспечана кадрамі. І, як падкрэсліў кіраўнік раёна Міхаіл Анікееў на сустрэчы з дэпутатамі Нацыянальнага сходу, у Горках не баяцца актыўна браць на працу моладзь, давяраюць ім кіраваць і задаволеныя вынікамі. Тром кіраўнікам сельскіх гаспадарак Горраччыны яшчэ не споўнілася і 30 гадоў. Большасць працаўнікоў — таксама маладыя людзі.

Дэпутаты Нацыянальнага сходу наведалі вучэбна-доследную гаспадарку акадэміі, аграгарадкі Паршына і Аўсянку.

— Мы хочам не назіраць збоку, а на свае вочы бачыць, дзе нам трэба паправіць заканадаўства для паспяховай рэалізацыі праграмы адраджэння вёскі, — зазначыў намеснік старшыні Парламенцкай камісіі па аграрных пытаннях Мікалай Куцко. — Гэта праграма напружаная, дарагая, але без яе не абысціся, бо яна арыентаваная на будучае.

Дэпутаты лічаць, што трэба быць сляпым, каб не бачыць вынікі першых двух гадоў рэалізацыі праграмы адраджэння вёскі. Мяняецца аблічча сельскай мясцовасці, з'яўліся аграгарадкі. Мікалай Куцко засцерагае ад памылак: напрыклад, нельга здаць аграгарадок без водаправода. На яго погляд, калі маладая гаспадыня не зможа падключыць сучасную пральную машыну, наўрад ці яна задаволіцца бытавымі ўмовамі і застанецца тут жыць.

— Для адраджэння вёскі трэба стварыць такія ўмовы жыцця і працы, каб яны нічым не адрозніваліся ад гарадскіх альбо былі набліжаныя да іх, — падтрымлівае калегу дэпутат ад Горацкай выбарчай акругі Таццяна Асмалоўская. — Каб у людзей, якія ў любую непагадзь выходзяць на палі і выконваюць харчовую праграму, у хаце было цёпла, быў газ, гарачая вада. А таксама каб іх дзеці вучыліся ў сучасных навучальных установах і нічым не адрозніваліся ад гарадскіх .

Але найперш усё ж праца і заробак. Мікалай Куцко паведаміў, што рыхтуецца праект дэкрэта Прэзідэнта аб стварэнні ўмоў для развіцця прадпрымальніцтва ў вёсцы.

— Патрэбны асаблівыя эканамічныя ўмовы для развіцця сельскага прадпрымальніцтва, — упэўнены намеснік старшыні парламенцкай камісіі па аграрных пытаннях. — Для развіцця фермерства і стварэння малых заводаў, для ўсяго, што датычыць не толькі сельскай гаспадаркі, але таксама і сферы паслуг і чаго заўгодна, на чым можна зарабіць грошы. Гэта новы этап у адраджэнні ўсёй эканомікі краіны, ад вялікіх гарадоў да малых сельскіх населеных пунктаў.

Ілона ІВАНОВА,
Горацкі раён.

Генадзь ЛЯПУНОЎ, першы намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі:

«БЕЛАРУСЫ ПАВІННЫ СТАЦЬ САПРАЎДНЫМІ ГАСПАДАРАМІ СВАЙГО ЖЫЛЛЯ»

25 сакавіка работнікі жыллёва-камунальнай галіны адзначаюць сваё прафесійнае свята. Напярэдадні знамянальнай даты звычайна падводзяцца вынікі працы, вызначаецца стратэгія развіцця на будучыню. Як выглядае сённяшні дзень галіны, у чым асноўны сэнс усіх пераўтварэнняў, што адбываюцца ў ЖКГ? Аб усім гэтым — першы намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь ЛЯПУНОЎ.

— Галоўнай задачай работы прадпрыемстваў сістэмы ЖКГ было і застаецца поўнае і своечасовае забеспячэнне насельніцтва і аб'ектаў народнай гаспадаркі комплексам жыллёва-камунальных паслуг у патрэбных аб'ёмах, з належным узроўнем якасці і пры мінімальных затратах. Аб'ём платных жыллёва-камунальных паслуг, якія летась былі аказаны насельніцтву, склаў 2,21 трыльёна рублёў. Гэта на 4 працэнты больш, чым за 2005 г. (адпаведны планавы паказчык — 2—3 працэнты). Адзін з асноўных шляхоў кампенсацыі змяншэння даходаў арганізацый ЖКГ — павелічэнне аб'ёмаў рэалізацыі дадатковых платных паслуг. Яны запатрабаваныя ў жыхароў: летась такіх паслуг было аказана на 118 мільярдаў рублёў, што на 5 працэнтаў больш, чым у 2005 г.

У галіне актыўна праводзіцца работа па змяншэнню затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг. Летась адпаведныя выдаткі ўдалося знізіць на 4,7 працэнта. Такія тэмпы адпавядаюць заданням праграмы развіцця ЖКГ, у адпаведнасці з якой штогод затраты павінны «мінусаваць» на 4 працэнты, а да 2010 г. трэба выйсці на ўзровень 20 працэнтаў. Планавай мяжы магчыма дасягнуць за кошт эфектыўнага ўкаранення энергазберагальных тэхналогій, гэты накірунак сёння — адзін з найбольш актуальных. Для рэалізацыі Дзяржаўнай комплекснай праграмы мадэрнізацыі асноўных вытворчых фондаў Беларускай энергетычнай сістэмы, энергазберажэння і павелічэння долі выкарыстання ў рэспубліцы ўласных паліўна-энергетычных рэсурсаў у ЖКГ летась распрацаваны, зацверджаны і рэалізаваны шэраг важных мерапрыемстваў. Сярод іх — галіновая праграма энергазберажэння, у адпаведнасці з якой у мінулым годзе прадугледжвалася зэканоміць 201,5 тысячы тон умоўнага паліва. Фактычная эканомія аказалася большай — 213,2 тыс. тон.

Актыўна рэалізуюцца дзяржаўныя праграмы па водазабеспячэнню і водаадвядзенню «Чыстая вада», адраджэнню і развіццю вёскі, а таксама праграма па выкарыстанню ў арганізацыях жыллёва-камунальнай гаспадаркі мясцовых відаў паліва і замене катлоў з нізкім каэфіцыентам карыснага дзеяння на больш эфектыўныя. Летась было ўстаноўлена 308 котлаагрэгатаў на мясцовым паліве. Вялікая ўвага надаецца і рэалізацыі праграмы па замене цепласетак, якія працяглы тэрмін знаходзяцца ў эксплуатацыі. Летась у гэтым накірунку спрацавалі паспяхова — пры плане 538,5 кіламетра фактычна было заменена 591,4 км трубапровадаў.

Інтэнсіўна праводзіцца і капітальны рамонт жылля. Гэта адзін з асноўных накірункаў, належнае выкананне мерапрыемстваў якога забяспечвае захаванасць жылфонду, надзейнасць сістэм інжынернага абсталявання, загараджальных канструкцый дамоў і змяншэнне затрат на іх бягучае ўтрыманне. У 2003 г. (упершыню за папярэднія 12 гадоў) удалося не толькі дасягнуць, але і перавысіць узровень 1990 г. — пасля капітальнага рамонту было ўведзена 645,8 тысячы квадратных метраў жылля. Паказчык увесь час стабільна павялічваўся: у 2004 г. ён склаў 695 тыс. кв. м, а ў 2005-м — 753 тыс. кв. м. Летась аб'ём капрамонту дасягнуў 857 тыс. кв. метраў, што на 14 працэнтаў больш, чым за папярэдні год. Адпаведная плававыя заданні выканалі ўсе вобласці і сталіца. Пасля цеплавой мадэрнізацыі жылых дамоў уведзена больш чым 244 тысячы квадратных метраў. Гэта на 41 працэнт больш, чым у 2005 годзе. Тэмпы капітальнага рамонту не будуць змяншацца і надалей — плануецца, што штогод рост аб'ёмаў адпаведных работ павінен складаць не менш чым 10 працэнтаў.

На працягу мінулага года праводзілася актыўная работа па абсталяванню пад'ездаў шматкватэрных дамоў дзвярамі ўзмоцненых кантструкцый і дамафонамі. У выніку зараз такім чынам «зачынена» 85 працэнтаў усіх пад'ездаў (82,6 з 97,3 тыс.). На гэтыя патрэбы ў тым ліку прыцягнута больш чым 15 мільярдаў рублёў сродкаў жыхароў. Летась удалося адрамантаваць 2,5 мільёна кв. метраў дахаў, што на 20 працэнтаў больш, чым у 2005 годзе. Такі аб'ём работ адпавядае нарматыву рамонту.

Летась працягвалася абсталяванне жылфонду індывідуальнымі прыборамі ўліку расходу вады. Устаноўлена 1,9 мільёна лічыльнікаў (у тым ліку ў мінулым годзе — 199 тыс.). Усяго індывідуальнымі прыборамі ўліку вады зараз абсталявана 32,5 працэнта кватэр. Гэтую работу неабходна праводзіць больш актыўна, паколькі адпаведны напрамак — адзін з важнейшых рэсурсаў на шляху эканоміі.

Працягваецца сістэмная работа па добраўпарадкаванню населеных пунктаў. Летась набыта 363 адзінкі спецыялізаванай уборачнай тэхнікі. Для забеспячэння аб'ектаў азелянення якасным пасадачным матэрыялам шырокага асартыменту ў мінулым годзе закладзена 3,75 гектара дэкаратыўных гадавальнікаў. Быў дасягнуты 100-працэнтны ахоп планава-рэгулярнай ачысткай шматкватэрных жылых дамоў і прыватнага сектара ў гарадах і вёсках. Ахоп раздзельным зборам смецця павялічыўся з 30 да 41,8 працэнта. На базе арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі адкрыта 118 комплексных прыёмных пунктаў другаснай сыравіны. У галіне поўнасцю выконваюцца ўсе 11 нарматываў сацыяльных дзяржаўных стандартаў.

Жыхара трэба зрабіць саюзнікам і непасрэдным удзельнікам усіх спраў. Гэта можна па праву лічыць асноўнай задачай удасканалення абслугоўвання насельніцтва. Трэба стварыць належныя ўмовы для самаарганізацыі грамадзян у жыллёвай сферы, да прыкладу, праз стварэнне таварыстваў уласнікаў. Дзяржава будзе ўсяляк падтрымліваць у гэтым людзей. Беларусы павінны нарэшце стаць сапраўднымі гаспадарамі свайго жылля. Трэба завяршыць работу па прызначэнню ўпаўнаважаных асобаў па тых сумесных домаўладаннях, дзе не абраны спосаб кіравання. Мы падышлі да неабходнасці ўвядзення пасады кіраўніка дома, як гэта прадугледжана Законам «Аб сумесным домаўладанні» і спецыяльнай пастановай урада. Кіраўніком дзяржавы падтрыманы прапановы міністэрства па павышэнню эфектыўнасці работы ЖКГ. Гэтыя меры знайшлі адлюстраванне ў адпаведным Указе ад 6 кастрычніка 2006 года. Асноўнымі задачамі, якія вызначаны гэтым дакументам, з'яўляюцца планаванне на падставе планава-разліковых цэн, змяншэнне затрат, мадэрнізацыя асноўных фондаў, фінансавае аздараўленне арганізацый, спісанне жыхарам пені па безнадзейнай запазычанасці, абсталяванне жылфонду індывідуальнымі прыборамі ўліку вады. У 2007 год галіна ідзе да насельніцтва з новым значэннем абрэвіятуры (ЖКХ — «Живи как хозяин»). У гэтым, напэўна, галоўны сэнс працы сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Паспяховаму вырашэнню ўсіх задач, якія пастаўлены перад галіной, садзейнічаюць высокі прафесіяналізм дзесяткаў тысяч рабочых, спецыялістаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый нашай сістэмы. Віншую ўсіх работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі з прафесійным святам, зычу ўсім моцнага здароўя, поспехаў у працы, дабрабыту і шчасця. Упэўнены, што нашымі агульнымі намаганнямі ўдасца захаваць і прымножыць тыя станоўчыя тэндэнцыі, якія намеціліся ў развіцці жыллёва-камунальнай галіны.

Падрыхтаваў Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Шайбу, шайбу!

«ДЫНАМА» ВЯДЗЕ

Мінскае «Дынама» знаходзіцца на палове дарогі да перамогі ў Адкрытым чэмпіянаце Беларусі па хакею. У фінальнай серыі з «Керамінам» каманда Эдуарда Занкаўца вядзе з лікам 2:0, прычым у абодвух матчах «беларблакітныя» выйгравалі на пляцоўцы саперніка.

У першай сустрэчы дынамаўцы разграмілі падначаленых Андрэя Гусава з лікам 6:1 (2:0, 2:0, 2:1). Калі ў першым паядынку гаспадары ўступілі буйна, то ў другім матчы адразу захапілі лідарства і вялі ў ліку (2:0) ажно да трэцяга перыяду. Аднак за некалькі хвілін госці змаглі выйсці наперад — 3:2. Наступныя гульні адбудуцца 24 і 25 сакавіка ў мінскім Палацы спорту.

Гульня № 1

ГУБЛЯЕМ ІГРАКОЎ, АЛЕ НЕ НАДЗЕЮ НА ПЕРАМОГУ

Да адборачнага матча чэмпіянату Еўропы-2008 з Люксембургам (пройдзе 24 сакавіка ў гасцях у 18 гадзін па беларускім часе) нацыянальная зборная Беларусі па футболу рыхтавалася ў нямецкім Руйце. Каманда Юрыя Пунтуса праверыла свае сілы ў таварыскім матчы з ФК «Афердзінген» і лёгка справілася з шостай камандай нямецкага дывізіёна — 14:0. Гэта перамога павінна была дадаць нашым футбалістам упэўненасці перад гульнёй з люксембуржцамі, калі б настрой ігракоў не сапсаваў шэраг траўмаў: у час трэніроўкі Арцём Канцавы атрымаў пералом скулавой косці, ад нагрузак апухла калена ў Аляксандра Глеба, запаліліся мышцы шыі ў капітана каманды Сяргея Штанюка, нагадала аб сабе і старая траўма Дзяніса Коўбы.

«НАФТАН» АБО «ВІЦЕБСК»?

Першы «Кубак федэрацыі» 25 сакавіка паміж сабой разыграюць футбалісты «Нафтана» і «Віцебска». У паўфінале навапалачане перамаглі дэбютанта вышэйшай лігі «Смаргонь» — 4:2, а віцябляне — ждановіцкую «Дарыду» — 1:0.

Ірына ПРЫМАК.

Суд ды справа

Працэс з працягам

У Гомельскім следчым ізалятары завяршылася другая частка «судовай эпапеі» над злачыннай арганізацыяй, сумнавядомай пад назвай «пажарнікі».

Гэтым разам на лаве падсудных апынуліся 18 чалавек, 1 бандыт да «суднага дня» не дажыў — пакончыў жыццё самагубствам у камеры СІЗА. На рахунку «другой партыі пажарнікаў» больш чым 30 цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, у тым ліку забойствы, выкраданні людзей, згвалтаванні, вымагальніцтва. Таму і прысуд бандытам быў даволі суровы. Кожны з удзельнікаў злачыннай арганізацыі ў залежнасці ад цяжару ўчыненага атрымаў прыгавор ад 4 да 15 гадоў пазбаўлення волі.

Варта нагадаць, што банда «пажарнікаў» на працягу 10 гадоў тэрарызавала жыхароў Гомеля, наводзіла жах на прадпрымальнікаў, якія гандлявалі на мясцовым рынку. З нязгоднымі плаціць «аброк» сурова распраўляліся: падпальвалі іх гандлёвыя аб'екты, аўтамабілі, жыллё. Менавіта таму злачынная арганізацыя і атрымала назву «пажарнікі». Усяго на рахунку «пажарнікаў» больш за 100 злачынстваў. Суд над «першай партыяй» бандытаў пачаўся 22 лістапада 2005 года і працягваўся 7 месяцаў. Тады 27 удзельнікаў злачыннай арганізацыі атрымалі ў залежнасці ад ступені віны ад 3 да 14 гадоў пазбаўлення волі. Аднак ставіць кропку ў гэтай справе яшчэ рана. Сямёра членаў банды, у тым ліку і яе завадатары на чале з Генадзем Бярэзіным, зараз чакаюць экстрадыцыі з Расіі ў Беларусь. Іх «судныя дні» наперадзе. Але і пасля трэцяга працэсу над «пажарнікамі» павінен быць працяг, бо яшчэ трое бандытаў знаходзяцца ў вышуку.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ

эмитента ценных бумаг ОАО «РАПС»
223014 Минский р-н, д. Крупица

Бухгалтерский баланс на 1 января 2007 г.

№ п/п	Наименование показателя	Код строки	На начало года	На конец года
	АКТИВ			
1	Внеоборотные активы	190	11403	15877
2	Оборотные активы	290	5852	8832
	БАЛАНС	390	17258	24709
	ПАССИВ			
3	Источники собственных средств	590	9680	12638
4	Доходы и расходы	690	226	224
5	Расчеты	790	7352	11847
	БАЛАНС	890	17258	24709

Отчет о прибылях и убытках за 2006 г.

№ п/п	Наименование показателя	Код строки	За отчетный год	За прошлый год
1	Выручка от реализации продукции без налогов	030	13721	10215
2	Себестоимость реализованной продукции, работ и услуг	040	13512	8870
3	Расходы на реализацию	060	19	22
4	Прибыль (убыток) от реализации	070	190	1323
5	Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	130	-42	6
6	Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	190	712	225
7	Прибыль (убыток) отчетного года	200	860	1554
8	Налоги и сборы из прибыли	210	123	358
9	Расходы и платежи из прибыли	220	27	-
10	Прибыль (убыток) к распределению	240	710	1196

Директор Ломако М.С.
Гл. бухгалтер Побудей Н.В.

27 апреля 2007 года состоится общее собрание акционеров

ОАО «Лукомльэнергомонтаж»,

расположенного по адресу: г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8

Собрание пройдет по адресу: г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, актовый зал

Повестка дня собрания:

1. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2006 году.
2. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2006 году и основных направлениях развития Общества на 2007 год.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2006 год.
4. Утверждение годового отчета бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества.
5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2005 год.
6. О принятии Устава ОАО «Лукомльэнергомонтаж» в новой редакции в соответствии с Законом Республики Беларусь «О хозяйственных обществах».
7. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2007 год и первый квартал 2008 года.
8. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Утверждение размера вознаграждений членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8 (приемная) с 23 по 26 апреля 2007 года (время работы с 8.00 до 16.30) либо 27 апреля 2007 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания **с 8.00 до 9.45** по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 27 апреля 2007 года в 10.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 23 марта 2007 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
— акционеру общества — паспорт;
— представителю акционера — паспорт и доверенность.

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды

(паштовы індэкс) (адрас)

Каму

(прозвішча, ініцыялы)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:

(індэкс выдання)

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі _____ руб. | пераадрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды

(паштовы індэкс) (адрас

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

23
САКАВІКА
2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 12 (15463)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Аляксандр РАДЗЬКОЎ:

«РУХАВІКОМ ПРАГРЭСУ З'ЯЎЛЯЮЦЦА ЛЮДЗІ З НЕСТАНДАРТНЫМ МЫСЛЕННЕМ»

Летась на міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы, якая праходзіла ў Мексіцы, беларусы выклікалі сапраўдны фурор, выставіўшы на спаборніцтвы 11-гадовага ўдзельніка — вучня гомельскай шматпрофільнай гімназіі № 56 Гену Караткевіча. **Міністр адукацыі Аляксандр РАДЗЬКОЎ** прызнаваўся, што ў яго былі сумненні, а ці варта падвяргаць хлопчыка такому моцнаму псіхалагічнаму стрэсу. Хоць для таго, каб трапіць у алімпійскую зборную, трэба прайсці праз «рэшата» школьных, раённых, абласных і рэспубліканскіх алімпіяд. А Генадзь не толькі ўдзельнічаў, але і перамагаў на рэспубліканскіх алімпіядах.

У Мексіку Гена Караткевіч паехаў у кампаніі больш вопытных старэйшых таварышаў, якія ўжо мелі ўзнагароды міжнародных спаборніцтваў. Мікіта Леснікаў і Уладзімір Міняйлаў прывезлі на радзіму залатыя медалі, а Гена стаў уладальнікам «серабра», прычым па колькасці набраных балаў ён толькі крышачку не дацягнуў да залатой узнагароды. Калісьці такіх як Гена дзяцей называлі вундэркіндамі, але цяпер гэта слова не ў модзе. Наўрад ці хтосьці адсочваў раней, як складваліся лёсы маленькіх геніяў, ці ўдавалася ім упісацца ў дарослае жыццё і не згубіць сваю індывідуальнасць. А сем'і, у якіх выхоўваліся незвычайныя дзеці, не атрымлівалі неабходнай педагагічнай і псіхалагічнай падтрымкі.

Педагогі, якія працуюць з Генай Караткевічам, канстатуюць, што яго логіка і інтуіцыя ні з чым непараўнальныя. Інакш як можна патлумачыць тую акалічнасць, што хлопчык, не маючы адпаведнай матэматычнай падрыхтоўкі і не ведаючы законаў фізікі, рашае задачы па праграмаванню нароўні са старшакласнікамі?

Пэўны час таму кіраўніком нашай дзяржавы была пастаўлена задача стварыць банк даных адоранай моладзі, які ўключае на сёння 5857 чалавек (школьнікаў, гімназістаў, ліцэістаў, студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, спартсменаў і г.д.), і пошукі талентаў не спыняюцца.

— За лёсам кожнага з гэтых маладых людзей нам трэба прасачыць. Здараецца, што ў навуцы малады чалавек праяўляе сябе проста выдатна, але на вытворчасці яго лепшыя якасці аказваюцца незадзейнічаныя, — дзеліцца сваімі думкамі Аляксандр Радзькоў. — І я асабіста бачу нашу задачу ў тым, каб правільна пралічыць, дзе і як можна найбольш эфектыўна выкарыстаць яго патэнцыял. Нашай краіне патрэбныя людзі з нестандартным мысленнем. Менавіта яны з'яўляюцца рухавіком любога грамадства, любой навуковай тэорыі, эканамічнай і вытворчай сфер. І мне прыемна канстатаваць, што ў Беларусі створан1а сістэма работы з таленавітай моладдзю. Прэміі, стыпендыі, матэрыяльную дапамогу са спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў атрымалі за 11 гадоў яго дзейнасці больш за 14 тысяч чалавек. Званне стыпендыята і лаўрэата прэзідэнцкага фонду — не проста ўзнагарода, а знак таго, што дзяржава брэ на сябе адказнасць за далейшае прафесійнае станаўленне маладога чалавека. Мы стварылі сістэму пошуку юных талентаў і будзем імкнуцца да таго, каб работа з таленавітай моладдзю была максімальна эфектыўнай.

На прайшоўшым днямі на базе БДЭУ пасяджэнні «круглага стала» якраз абмяркоўваліся пытанні ўдасканалення работы з адоранай моладдзю, іх дзяржаўнай падтрымкі і сацыяльнай абароны. Да гутаркі былі запрошаны педагогі і кіраўнікі навучальных устаноў, навукоўцы і дэпутаты, прадстаўнікі мясцовых органаў кіравання і міністэрстваў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ»)

Дзесяцікласнікі кадэцкага класа Ашмянскай сярэдняй школы № 2. На першым плане Аляксандр РАЗВАДОЎСКІ, Марына САДОЎСКАЯ і Дзмітрый ПУЗЫНА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Віктар ФІСЮК:

«ЗВЫШЗАДАЧА — НАВУЧЫЦЬ МАЛАДОГА ЧАЛАВЕКА ПЕРААДОЛЬВАЦЬ СВАЮ ПАСІЎНАСЦЬ»

Сёння мы прадстаўляем першага сакратара Брэсцкага абласнога камітэта БРСМ Віктара ФІСЮКА. Хоць Віктару зараз 31 год, але ў яго вялікі вопыт удзелу ў розных маладзёжных арганізацыях. Школьнікам ён паспеў яшчэ ўступіць у ВЛКСМ, так бы мовіць, у апошні вагон. Працяглы час працаваў у Беларускім патрыятычным саюзе моладзі, затым у органах выканаўчай улады. А два гады таму ўзначаліў абласную арганізацыю цяперашняга камсамола. Супраць такой назвы іх арганізацыі брэсцкі лідар зусім не пярэчыў. Сказаў, што яны адчуваюць сябе пераемнікамі традыцый былога камсамола. Толькі, вядома, у сучасным увасабленні.

— Чым вызначаецца сёння Брэсцкая абласная арганізацыя БРСМ, чым яна адрозніваецца ад іншых?

— Гэта вельмі складанае пытанне. Можна гаварыць пра многія складовыя закранутага аспекта. Вядома, у нас свае традыцыі, адметнасці, сваю візітную картку мае кожная раённая арганізацыя. Напрыклад, мы плённа супрацоўнічаем з мемарыяльным комплексам «Брэсцкая крэпасць-герой». Мы і грошы заработалі на суботніках для папаўнення капілкі рэканструкцыі мемарыялу. Школьнікі — члены саюза — нясуць ганаровую вахту каля Вечнага агню. Членскія білеты новым сябрам арганізацыі стараемся ўручаць на плошчы Цырыманіялаў ля галоўнай кампазіцыі крэпасці, каб гэта было вельмі ўрачыста і маладым людзям запомнілася. Вядома ж, віцебскія ці магілёўскія нашы таварышы выкарыстоўваюць для патрыятычнага выхавання нейкія свае святыні.

Можна гаварыць і аб тым, што маладыя выхадцы з палесскага краю адрозніваюцца ўдумлівасцю, разважлівасцю, і пустымі лозунгамі, ура-патрыятычнымі заклікамі іх у арганізацыю не прыцягнеш. Каб чалавек паверыў у тое, што яму прапануюць, трэба паказаць яму канкрэтную справу. Калі юнак або дзяўчына ўбачаць, што тут можна нечаму навучыцца, можна сябе рэалізаваць, яны прыйдуць у арганізацыю.

— Колькі членаў саюза вы маеце зараз у абласной арганізацыі?

— На пачатак сакавіка на ўліку стаяла 53 312 чалавек. Але мы ніколі не ставілі задачу гнацца за колькасцю. Гэта небяспечная тэндэнцыя. Нам не патрэбны фармальныя члены, фармальныя пярвічкі. Сваю задачу мы бачым у тым, каб прыцягнуць найбольш актыўную частку моладзі. А ўжо самыя перадавыя, самыя актыўныя нейкім чынам паўплываюць і на астатніх. Кожны з іх працуе, вучыцца ў нейкім канкрэтным калектыве.

Як я ўжо гаварыў, адным з прызначэнняў нашай арганізацыі з'яўляецца стварэнне ўмоў для самарэалізацыі маладога чалавека. Гэта не пад сілу толькі сакратарам абласной, раённых арганізацый, але пад сілу актыву, той самай перадавой, падрыхтаванай частцы.

— Калі я правільна зразумела, былы камсамольскі лозунг-заклік «Калі не ты, то хто!?» актуальны і зараз. Зрабіць цікавым і змястоўным сваё жыццё павінны самі члены пярвічак разам са сваімі актывістамі...

— Толькі так і не інакш. Сваёй амаль што звышзадачай мы лічым навучыць маладзь пераадольваць сваю пасіўнасць. Гэта не столькі нават важна для існавання нейкай канкрэтнай пярвічкі, колькі для далейшага жыцця моладзі і для жыцця дзяржавы ў цэлым. Ад пазіцыі кожнага члена грамадства залежыць, у якой краіне будзе жыць кожны з нас, яго родныя і блізкія. Праблема пасіўнасці цесна звязана амаль з усімі заганамі грамадства.

Пасіўны той, хто праходзіць міма п'янства і антысацыяльных паводзінаў, глумлення над прыродай, знявагі да старэйшых. Менавіта на ўсведамленне сябе як часткі соцыуму, грамадзяніна сваёй краіны мы накіроўваем свае мерапрыемствы і акцыі, такія, напрыклад, як «За моцную і квітнеючую Беларусь».

Актыўная пазіцыя выхоўвае таксама адказнасць за ўсё, што адбываецца навокал. Наша арганізацыя прымала ўдзел у выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў. 304 члены БРСМ былі вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты. 290 з іх прайшлі ў Саветы ўсіх узроўняў. Многія таксама працавалі ў камісіях, выступалі ў якасці назіральнікаў за працэсам выбараў. Удзел у такой адказнай дзяржаўнай кампаніі, вядома ж, спрыяе выхаванню актыўнай жыццёвай пазіцыі, не гаворачы аб тых нашых таварышах, якія нароўні з дарослымі, сталымі людзьмі будуць працаваць у прадстаўнічых органах улады і, адпаведна, несці адказнасць.

— Увесь час мы вядзём гутарку вакол членаў, актывістаў вашай арганізацыі. А калі б, скажам, вы ці вашы калегі сутыкнуліся з фактам несправядлівасці ў адносінах да маладога чалавека, які не мае дачынення да вашага саюза, як сябе паводзілі б?

— У Статуце БРСМ выкладзены нашы мэты і задачы, там нідзе няма спасылак, што ўсё датычыцца выключна членаў арганізацыі. Моладзь мы не дзелім на сваіх і чужых. У нас ёсць магчымасць абараняць інтарэсы моладзі на ўзроўні ўлады. Сакратары раённых камітэтаў, як правіла, уваходзяць у склад раённых выканкамаў. Мы вітаем уступленне ў саюз, але гэта не азначае, што мы закрытыя для іншых маладых людзей.

— Апошняе распаўсюджваецца і на адзін з самых папулярных накірункаў дзейнасці — студэнцкія і працоўныя атрады?

— Так. Тут ёсць вялікая спакуса паставіць умовай выезду ў атрад уступленне ў арганізацыю. Але мы на гэта не ідзём. Хлопец ці дзяўчына пасля працоўнага семестра самі вырашаюць, быць ім з нашай арганізацыяй, з якой другой або наогул вырашаць усе свае праблемы самастойна. Летась у вобласці быў сфарміраваны 141 студэнцкі атрад, на працу выехалі больш за пяць з паловай тысяч студэнтаў, навучэнцаў. Ведаеце, многія менавіта пасля працоўнага семестра напісалі заявы ў БРСМ. Засталіся пасля будатрадаўскіх тыдняў сябры, аднадумцы, з якімі было цікава. Прыклад таго, аб чым я гаварыў: актывісты пацягнуць за сабой астатніх. Такое папаўненне, якое прыйшло праз канкрэтныя справы, мы асабліва цэнім.

— Наколькі я ведаю, лепшым у справе арганізацыі працоўных атрадаў па выніках мінулага года быў прызнаны Столінскі раённы камітэт. Як атрымалася, што лідарам стаў самы аддалены раён, дзе мала навучальных устаноў?

— Столінская арганізацыя ў нас па ўсіх паказчыках адна з лепшых. Так гістарычна склалася. Століншчына — густанаселены край. Натуральна, што там аказалася шмат маладых людзей, якія з карысцю захацелі правесці лета. А раённыя актывісты своечасова падтрымалі ініцыятыву, арганізавалі атрады.

Трэба сказаць, што свае адметныя справы мае кожная раённая арганізацыя. Пры Брэсцкім гарадскім камітэце створаны ваенна-патрыятычны клуб «Рубеж», які займаецца пошукам імёнаў загінулых у Вялікай Айчыннай вайне. Актывісты клуба нават сталі актыўнымі ўдзельнікамі выставы ў абласным краязнаўчым музеі «Праз дзве вайны». Пружанцы традыцыйна праводзяць лагер для падлеткаў, у які бяруць і тых, хто стаяў на ўліку ў міліцыі, каго называюць «цяжкімі».

А здабыткам абласной арганізацыі можна назваць правядзенне на працягу дзевяці гадоў конкурсу маладых мадэльераў «Стыль». Гэты лютаўскі паказ моды набыў папулярнасць у абласным цэнтры і збірае ўсё больш гледачоў. На яго звярнуў увагу наш знакаміты мадэльер Саша Варламаў і штогод прыязджае на мерапрыемства, праводзіць майстар-класы для ўдзельнікаў, большасць з якіх — навучэнцы ПТВ.

— Хацелася б даведацца, які ўплыў мае ваша арганізацыя ў асяродку вясковай моладзі?

— Калі праілюстраваць лічбамі, то нашы пярвічкі ёсць у цэнтральных сядзібах дзвюх трацей сельгаспрадпрыемстваў вобласці. Мы разумеем, што павінны ісці ў вёску, бо ў вясковай моладзі менш магчымасцяў для самарэалізацыі нават у параўнанні з гарадскімі равеснікамі. Таму перад намі стаіць задача да 2008 года заснаваць свае пярвічныя арганізацыі ва ўсіх вёсках, дзе ёсць дзяржаўныя прадпрыемствы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Светам кіруе дабрыня

Камп'ютар і лічбавы фотаапарат ад Цэнтральнага камітэта БРСМ былі ўручаны выхаванцам Смалявіцкага сацыяльна-педагагічнага цэнтра ў рамках акцыі саюза «Светам кіруе дабрыня».

Акрамя гэтага, 25 дзетак, што воляй лёсу засталіся без бацькоўскага цяпла і знаходзяцца ў Смалявіцкім сацыяльна-педагагічным цэнтры, атрымалі па салодкаму падарунку, а таксама — музычнаму: намаганнямі актывістаў маладзёжнай арганізацыі для выхаванцаў быў наладжаны канцэрт. У рамках гэтага мерапрыемства адбылася і сустрэча дзяцей з першым сакратаром БРСМ Леанідам Кавалёвым.

Як адзначаюць у аддзеле ідэалагічнай і аналітычнай работы ЦК БРСМ, словы для дабрачыннай акцыі «Светам кіруе дабрыня» не выпадкова сталі дэвізам чарговага мерапрыемства саюза: нішто так не ўзвышае чалавека, як аказанне дапамогі і дабрачыннасці тым, хто мае ў гэтым патрэбу.

Ігар ГРЫШЫН.

Апошні «акорд» рэспубліканскай алімпіяды

З 26 па 31 сакавіка ў Беларусі пройдзе заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па агульнаадукацыйных прадметах. Чакаецца, што ўдзел у ім возьмуць 1464 чалавекі.

Сталіца рыхтуецца сустрэць удзельнікаў спаборніцтваў па фізіцы, астраноміі і рускай мове. У Баранавічах пройдзе рэспубліканская алімпіяда па матэматыцы, у Гомелі — па біялогіі і хіміі, у Мазыры — па беларускай мове, у Віцебску — па інфарматыцы, у Полацку — па замежных мовах, у Бабруйску — па геаграфіі. Каманды па працоўнаму навучанню збяруцца ў Гродне, а ў Магілёве пройдзе алімпіяда па гісторыі і дыскыпліне «Чалавек. Грамадства. Дзяржава».

Трэба зазначыць, што ў гэтым навучальным годзе ўдзел у першым этапе рэспубліканскай алімпіяды ўзялі больш за 575 тысяч чалавек. У другім этапе, які праводзіцца на раённым узроўні, удзельнічалі 84 тысячы чалавек, а ўдзельнікамі абласнога этапу сталі 8058 чалавек. У Міністэрстве адукацыі з задавальненнем канстатуюць павелічэнне прадстаўніцтва сярод удзельнікаў алімпіяднага руху навучэнцаў прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Так, на абласным этапе колькасць навучэнцаў ПТВ складала трыццаць працэнтаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Размяркуюць, не размяркуюць?..

РАЗМЯРКУЮЦЬ!

У жыцці кожнага чалавека здараюцца такія падзеі, ад якіх можа залежыць увесь далейшы лёс. Нараджэнне, паступленне, вяселле... У гэты шэраг уваходзіць і працаўладкаванне (нездарма ж кажуць, што для шчасця патрэбны тры рэчы: здароўе, каханне і любімая праца). Але працаўладкаванню, як вядома, папярэднічае размеркаванне (выключэнне — студэнты платнай формы навучання). Прафсаюз надзяляе гэтаму пытанню немалую ўвагу. Напярэдадні размеркавання выпускнікоў ВНУ выйшаў зборнік нарматыўных прававых актаў і метадычных матэрыялаў, прысвечаны размеркаванню і працаўладкаванню. Акрамя гэтага, прайшоў семінар «Асаблівасці размеркавання выпускнікоў і працаўладкаванне маладых спецыялістаў» з удзелам намесніка старшыні Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Рамана Дапіры, старшыні пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ Ніны Радзевіч і загадчыцы аддзела прававой абароны, галоўнага інспектара працы Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларысы Манюк.

НЕ АДКЛАДВАЙ НА ЗАЎТРА...

Размеркаванне, як правіла, праводзіцца не пазней, чым за два месяцы да заканчэння выпускнікамі ўстаноў адукацыі. Для гэтага ствараецца камісія па персанальнаму размеркаванню. Яе састаў зацвярджаецца рэктарам. Акрамя прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі, дэкана факультэта, загадчыкаў кафедраў, у склад камісіі ўключаюцца і прадстаўнікі пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі, органаў студэнцкага самакіравання. Дзякуючы гэтаму, верагоднасць таго, што правы выпускніка будуць парушаны, зводзіцца да нуля.

Раман Восіпавіч пераканаўны, што ў рашэнні пытанняў размеркавання вялікае значэнне мае падрыхтоўчы этап:

— Кіраўнікі ўстаноў адукацыі павінны забяспечыць якаснае інфармаванне выпускнікоў да пачатку работы камісіі па размеркаванню. Часта студэнтам патрабуецца кваліфікаваная юрыдычная кансультацыя, асабліва пры змене месца жыхарства, прыналежнасці да вызначаных сацыяльных катэгорый (сіроты, інваліды, сямейныя і г.д.).

Магчымасці ўстаноў адукацыі абмежаваныя: на тры тысячы выпускнікоў можа быць толькі два-тры юрыдычныя кансультанты. Таму тут важную ролю адыгрываюць прафсаюзныя арганізацыі, якія звяртаюцца да юрыстаў вышэйстаячых прафсаюзных органаў, у галіновыя міністэрствы, органы выканаўчай улады, якія займаюцца аказаннем юрыдычнай дапамогай насельніцтву.

Паводле слоў Ніны Міхайлаўны, у галоўным корпусе БДУ трэці чацвер кожнага месяца на працягу дзвюх гадзін юрысты-практыкі прымаюць студэнтаў. Сярод усіх хвалюючых пытанняў на першы план выходзяць праблемы размеркавання, занятасці, кампенсацыі затрачаных дзяржавай сродкаў на падрыхтоўку будучых кадраў. Таму нядзіўна, што і ўвага да гэтых пытанняў адпаведная.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ»).

Фота Надзеі ДРЫПА.

Вольга БАРАБАНШЧЫКАВА:

«СЯМ'Я КАШТОЎНЕЙ ЗА ЛЮБУЮ КАР'ЕРУ»

Прыгожая, спартыўная, актыўная — гэта толькі некалькі эпітэтаў, якімі можна ахарактарызаваць Вольгу Барабаншчыкаву, тэлевядучую праграмы «Час спорту» на Першым нацыянальным, беларускую спявачку і новаспечанага трэнера. Тэніснаю кар'еру мінчанка завяршыла з-за траўмы, але, адклаўшы ракетку, Вольга стала сябе шукаць у жыцці па-за кортам. Нядаўна яе назначылі старшым трэнерам тэніснай асацыяцыі. Як разумееце, падстаў для гутаркі было дастаткова.

— Шчыра скажу, не чакала, што калі ты адкладзеш тэніснаю ракетку, возьмеш у рукі мікрафон і заспяваеш, бо звычайна пасля завяршэння кар'еры спартсмены ідуць у трэнеры...

— Калі я развіваласа са спортам, мне захацелася паспрабаваць сябе ў новых якасцях, бо ў жыцці ж шмат усяго цікавага і новага. Як стала спяваць? Музыка была ў маім жыцці з дзяцінства, таму што мой тата — былы музыкант.

— Якія новыя песні з'явяцца ў тваім рэпертуары?

— Усіх сакрэтаў не раскрыю. Скажу толькі, што гэта — павольная кампазіцыя аб унутраных перажываннях, практычна аб шчаслівым каханні. Ёсць некалькі песень, якія я напісала сама, але пакуль не рашаюся іх вынесці на суд слухачоў. Гэта як мае дзеткі. Новы альбом я не спяшаюся рабіць, а вось дыск з адноўленай вокладкай выпушчу, бо ён разышоўся вельмі добра, стаў лідарам продажаў.

— Тры гады таму ты рашылася ўзяць удзел у міжнародным фестывалі жаночага хараства «Пані Украіна Опел» і перамагла. Навошта табе было пацвярджэнне сваёй прыгажосці такім спосабам?

— Ну, гэта быў не стандартны конкурс прыгажосці, а конкурс для паспяховых жанчын, дзе патрэбна было дэманстраваць свой артыстызм і іншыя якасці. Узяць удзел у ім мяне ўгаварыў мой агент, ды і, шчыра кажучы, мне падабаецца эксперыментаваць. Люблю спрабаваць усё новае. Перамога дапамагла адчуць сябе больш упэўненай у сабе. Я ж не ўспрымаю сябе, як «зорку», таму мне патрэбна было прызнанне.

— У цябе ёсць сакрэты прыгажосці?

— Патрэбна любіць жыццё і весці актыўны лад жыцця. Канешне, ва ўсіх свае магчымасці, але галоўнае не сядзець дома на адным месцы і не казаць, як усё дрэнна. Мне наогул падаецца, што многія нашы людзі бачаць сваё жыццё ў шэрым колеры. Магчыма, нехта прачытае мае словы і падумае: ёй лёгка так казаць, але я ўпэўнена, што калі ў любога чалавека ёсць мэта, ён яе абавязкова дасягне рана ці позна. У сваім жыцці я многае зрабіла сама.

— Не разумею, як такая актыўная дзяўчына не рашылася паспрабаваць сябе ў першым у Беларусі рэаліці-шоў «Зорны цырк»?

— Мяне сапраўды запрашала прайсці адбор дырэктар цырка Таццяна Бандарчук, але я адмовілася, бо хацела паглядзець на якасць здымак, якой акажацца першы праект. Аднак нават не гэта прычына была галоўнай: мне не падыходзіў графік працы, бо часта выязджаю за мяжу і не магу знаходзіцца ў Мінску тры месяцы. А так мяне праца ў цырку вельмі зацікавіла. Як толькі пачула аб новым праекце, адразу прадставіла сябе пад купалам, бо мне падабаецца экстрым. Аднак не атрымалася. Магчыма, калі будзе працяг і больш зручны графік, мне дадуць шанц.

— У «Зорным цырку» вядучая Першага музычнага Люся Лушчык рашылася прадстаць перад гледачамі ў смешным вобразе, хоць вядомай дзяўчыне гэта цяжка зрабіць. Ты ўяўляеш сябе ў ролі клоуна?

— Я ніколі аб гэтым не думала. Пэўна, магу жартаваць над сабой і не пужаюся быць смешнай, але перад сваімі блізкімі. Магчыма, я змагла б паспрабаваць сябе ў ролі клоуна, але лягчэй сказаць, чым зрабіць.

— Нядаўна табе прапанавалі стаць трэнерам. Была гатовая да гэтага?

— Канешне, я ж сумавала па тэнісу. У душы мне вельмі хацелася вярнуцца на корт, падзяліцца сваім вопытам, які, як мне падаецца, быў бы вельмі карысны для маладых спартсменаў. І ўсё ж гэта прапанова мяне крыху здзівіла.

— Акрамя спявачкі і трэнера ты яшчэ і вядучая тэлепраграмы на Першым нацыянальным канале «Час спорту». У тваёй сям'і хтосьці яшчэ звязаны з «блакітным экранам»?

— Мая старэйшая сястра Каця Бягун працуе на Першым музычным канале. Шчыра скажу, што я з дзяцінства марыла аб тэлебачанні.

— Якія віды спорту табе цікавыя акрамя тэніса?

— Як вядучая спартыўнай праграмы я, зразумела, павінна заўжды быць у курсе выступленняў беларускіх спартсменаў. І ўсё ж у першую чаргу мне цікавы той від спорту, дзе ёсць мае добрыя знаёмыя. Напрыклад, з задавальненнем сачу за хакейнымі і футбольнымі матчамі. Вельмі хвалююся за сяброў, «хварэю» за іх.

— У тваім гардэробе ёсць самаробныя рэчы ці толькі адзенне, набытае ў модных буціках?

— Раней маці вязала для мяне прыгожыя кофтачкі і спадніцы. Зараз (навошта хлусіць?) я з задавальненнем набываю адзенне вядомых марак, але магу насіць і простую вопратку. Спалучаю дарагое і таннае. Атрымліваецца арыгінальна. Імкнуся сачыць за модай, але тое, што мне не падыходзіць, ніколі не апрану.

— Цябе пазнаюць у магазінах, кафэ і г.д. Як ставішся да ўвагі да сябе?

— Мяне яна не палохае і не перашкаджае.

Гасцёўня



— І ўсё ж ты заўжды на віду ў розных амплуа. Малады чалавек павінен цябе раўнаваць...

— Галоўнае не даваць нагоды для рэўнасці. Праўда, іншым разам яна патрэбна, каб малады чалавек не расслабляўся: ведаў, што на цябе звяртаюць увагу і іншыя. Дарэчы, калі з табой знаёмяцца мужчыны, гэта значыць, што ты падабаешся. На жаль, я не заўжды магу зразумець: са мной хочуць мець зносіны, таму што я цікавая чалавеку, або таму, што пазнаюць. Калі я раней тусавалася, у мяне было мноства знаёмых, якія пасля таго, як я пакінула тусоўку, адразу мяне пакінулі. У гэтым плане мне цяжка зараз знаходзіць сяброў, затое ёсць праверэныя гадамі сябры, сфармаванае кола блізкіх мне людзей. Мы дапаўняем адзін другога і нам цудоўна разам. Шкада толькі, што ў маіх сябровак мала вольнага часу, бо ў большасці з іх ужо дзеці.

— Як лічыш, ці варта сямейнае шчасце завяршэння кар'еры? Калі табе трэба будзе зрабіць выбар і пакінуць сцэну і тэлебачанне дзеля сям'і, пойдзеш на такі адказны крок?

— Нішто на гэтым свеце не можа столькі значыць, як сямейнае шчасце. Калі мне трэба будзе выбіраць паміж сям'ёй і працай, хутчэй за ўсё аддам перавагу сям'і, але пакуль рана аб гэтым казаць, хоць думка ад сваіх дзетках да мяне пачала прыходзіць усё часцей. Хацела б мець у будучым сына і дачушку.

— Што, на твой погляд, нельга дараваць сябрам, любімаму чалавеку?

— Складана дараваць здраду. Гэта магчыма, але пакідае ў душы пляму. У людзях мне не падабаецца няшчырасць. З астатнім мы неяк разбяромся.

Гутарыла Ірына ПРЫМАК.

ТЭАТР, МАЛАДОСЦЬ І ВЯСНА

У Магілёве адкрыўся Міжнародны маладзёжны тэатральны форум «М.@рт. Кантакт». У ім бяруць удзел 12 тэатральных калектываў з Расіі, Украіны, Літвы, Германіі, Польшчы. Канцэпцыя тэатральнага форуму: пра моладзь, для яе і ад яе. У форуме ўдзельнічаюць маладзёжныя трупы альбо ў спектаклях закранаюцца тэмы і праблемы, цікавыя менавіта маладым людзям.

Журы альбо экспертную камісію, у якую ўваходзяць прадстаўнікі розных краін, узначальвае беларускі драматург Сяргей Кавалёў. Сёлета журы на свой погляд адзначыць самыя яскравыя, цікавыя, відовішчныя работы. Узнагароджанне адбудзецца на закрыцці форуму 27 сакавіка.

Фінансуецца форум з бюджэту Магілёўскай вобласці. Штодня ў зале Магілёўскага драматычнага тэатра і ў канцэртнай зале філармоніі паказваюць два спектаклі. На наступную раніцу кожная з пастановак абмяркоўваецца на спецыяльных прэс-канферэнцыях у тэатральным кафэ.

Праграма форуму вельмі разнастайная. Тут ёсць класічная і сучасная драматургія, пластычны і музычны спектаклі, тэатр абсурду, армейскі трагіфарс, спектакль у стылі кабарэ і нават кухонная драма. Паводле слоў мастацкага кіраўніка форуму Уладзіміра Пятровіча, усе спектаклі зусім розныя, і цяжка прадказаць, каму аддасць свае сімпатыі магілёўская публіка і журы. Аднак ужо загадзя былі разабраны ўсе квіткі на спектакль Дзяржаўнага драматычнага тэатра «Прытулак камедыянта» з Санкт-Пецярбурга. І гэта нягледзячы на тое, што на спектаклі форуму квіткі падаражэлі і каштуюць 10 тысяч рублёў.

Дырэктар Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра Андрэй Новікаў падкрэсліў, што «М.@рт. Кантакт» — гэта не фестываль, а менавіта форум. Ён мае вялікую спецыяльную праграму: гэта майстар-класы (напрыклад, сярод педагогаў — сусветна вядомы спецыяліст па сцэнічнай мове Юрый Васільеў) і майстэрня маладой рэжысуры, дзе выпускнікі тэатральных навучальных устаноў будуць ставіць урыўкі з п'ес маладых беларускіх аўтараў.

— Нашы маладыя драматургі атрымліваюць прызы на конкурсах у Расіі і ў замежжы, а ў тэатрах Беларусі няма чаго ставіць, — пракаментаваў Андрэй Новікаў. — Мы хочам закрануць гэту тэму і прыцягнуць увагу да творчасці новых аўтараў.

Ілона ІВАНОВА.

ФІТНЭС І БОЎЛІНГ — БЯСПЛАТНА

У Мінску пры садзейнічанні гарадскога камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі распрацавана дысконтная сістэма для студэнтаў.

З маладзёжнымі забаўляльнымі цэнтрамі, папулярнымі начнымі клубамі і дыскатэкамі, спартыўнымі і фітнэс-заламі будуць заключаны пагадненні, згодна з якімі сталічныя студэнты атрымаюць магчымасць наведваць гэтыя месцы са значнымі скідкамі. Размова ідзе пра памяншэнне платы за ўваход і паслугі на 10—20 працэнтаў. А некаторыя ўпадабаныя клубы раз на месяц можна будзе наведваць нават бясплатна.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

«РУХАВІКОМ ПРАГРЭСУ З'ЯЎЛЯЮЦЦА ЛЮДЗІ З НЕСТАНДАРТНЫМ МЫСЛЕННЕМ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Мы ўсведамляем, што нават самая яркая таленавітасць не зможа рэалізавацца, калі дзяцей не навучаць спосабам творчай дзейнасці ў камандзе, — выказала пазіцыю сталічных педагогаў **намеснік старшыні Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Тамара ЗЛОБІНА.** — Невыпадкова сёння практычна ва ўсіх раёнах сталіцы адкрыты Цэнтры развіцця асобы, галоўная задача якіх заключаецца ў стварэнні ўмоў для развіцця крэатыўнага мыслення, зносінаў і псіхолага-педагагічнага суправаджэння дзіцячай таленавітасці з самага ранняга ўзросту. Трэба наладзіць патранат і маніторынг адаптацыі найбольш адораных дзяцей на ўсіх ступенях навучання: ад дашкольнай установы да ВНУ. Трэба забяспечыць пераемнасць у рабоце школ і ВНУ па развіццю адоранасці высокаматываваных дзяцей, асабліва ва ўмовах пераходу старшай ступені школы на прафільнае навучанне.

Ліцэй БДУ з'яўляецца, напэўна, адной з самых аўтарытэтных і паважаных у Беларусі агульнаадукацыйных устаноў. Па колькасці заваяваных яго выхаванцамі на розных алімпіядах і конкурсах узнагарод яму няма роўных: 779 прызёраў рэспубліканскіх алімпіяд і 111 прызёраў міжнародных алімпіяд за 17 гадоў дзейнасці. Магчыма, для многіх будзе адкрыццём, што ліцэй працуе на пяцідзёнцы, і яго выхаванцы не «задыхаюцца» ад вучэбных нагрузак.

Як расказала **дырэктар ліцэя Таццяна КАЛЕВІЧ,** у іх практыкуецца блочна-модульная сістэма выкладання няпрофільных дысцыплін. Для вывучэння многіх прадметаў адводзіцца не два гады, а адзін. Такім чынам, замест 15—16 вучэбных дысцыплін вывучаюцца адначасова 12—13. Гэта дазволіла скараціць вучэбныя нагрузкі на дзяцей і перайсці на пяцідзённы вучэбны тыдзень. Субота адводзіцца для дадатковых адукацыйных мерапрыемстваў у выглядзе алімпіяд, курсаў па выбару і заняткаў па інтарэсах.

— Яшчэ адна наша навацыя заключаецца ў тым, што профільныя прадметы вывучаюцца па чвэрцях, а няпрофільныя — па трыместрах, — дзеліцца вопытам Таццяна Калевіч. — Такім чынам нам удалося развесці ў часе выніковую атэстацыю, што таксама прывяло да зніжэння нагрузкі на навучэнцаў. На сёння мы прапануем ліцэістам больш за 60 курсаў па выбару. Аднак заўважылі, што найбольш запатрабаваныя дзецьмі тры напрамкі: курсы падрыхтоўкі да алімпіяд, курсы падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання і ўступных экзаменаў і курсы агульнага развіцця. Таксама мы заўважылі, што колькасць сярод паступіўшых у ліцэй слухачоў нашых вячэрніх курсаў працягвае расці (летась яна перавысіла 59 працэнтаў), што сведчыць аб запатрабаванасці школьнікамі дадатковых формаў атрымання якаснай адукацыі. А паколькі не ўсім школьнікам даступныя нашы курсы, мы вырашылі пашырыць магчымасці для дзяцей, стварыўшы адукацыйны сайт для дыстанцыйнага навучання (www.e-lyceum.by). Дзеці гатовыя да зносінаў з выкладчыкамі праз камп'ютар. Калі ж гаварыць аб праблемных пытаннях, то хацелася б звярнуць увагу на цяжкасці з фінансаваннем паездак дзяцей на разнастайныя турніры і канферэнцыі. Напрыклад, нашы выхаванцы апошнія два гады ўдзельнічаюць у Міжнароднай Жаўтыкаўскай алімпіядзе па фізіцы і матэматыцы, якая праходзіць у Казахстане, і ўзялі летась там Гран-пры. Але гэта паездка — вельмі далёкая, і акрамя Ліцэя БДУ больш ніхто не можа сабе яе дазволіць. Міжнародны турнір юных фізікаў пройдзе ў гэтым годзе ў Паўднёвай Карэі, і на сёння ўдзел беларускіх школьнікаў у гэтым турніры знаходзіцца пад вялікімі пытаннем.

Яшчэ больш вострыя праблемы ўзняў у сваім выступленні **дырэктар Лужаснянскай школы-інтэрнат-гімназіі для здольных і таленавітых дзяцей Віцебскай вобласці Уладзімір ШЫЦЬКО:**

— Адкрыццё нашай гімназіі на Віцебшчыне ўпершыню дазволіла дзецям з аддаленых сельскіх пунктаў, дзецям з малазабяспечаных сем'яў і сіротам атрымліваць якасную адукацыю, удзельнічаць і перамагаць у рэспубліканскіх і міжнародных алімпіядах. Не буду хаваць, што для таго, каб вясковыя дзеці дасягнулі высокіх вынікаў, педагогам даводзіцца з імі вельмі шмат працаваць. У гарадскіх гімназіях кантынгент першапачаткова больш моцны. Таму лічу, што найбольш творчых педагогаў, якія працуюць з вясковымі дзецьмі і дасягаюць заўважных вынікаў, трэба заахвочваць. На рэспубліканскіх алімпіядах уручаецца прыз міністра адукацыі лепшаму сельскаму школьніку, дык чаму б не прадумаць меры заахвочвання і для настаўнікаў? Падрыхтоўку педагогаў, якія працуюць з адоранымі дзецьмі, павінна ўзяць на сябе Акадэмія паслядыпломнай адукацыі, паколькі ў рэгіянальных інстытутаў павышэння кваліфікацыі настаўнікаў не хапае адпаведнага вопыту. Дарэчы, не зусім зразумела, чаму студэнты Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта праходзяць педагагічную практыку толькі на базе гарадскіх школ. Мы былі б радыя бачыць іх і ў нашай гімназіі, і ў сельскіх школах. Па-першае, у нас была б магчымасць прыгледзецца да найбольш перспектыўных студэнтаў, а па-другое, і яны маглі б адаптавацца да новага асяроддзя.

Сетка агульнаадукацыйных навучальных устаноў новага тыпу ўключае: 31 ліцэй, 138 гімназій, 6 вучэбных комплексаў «гімназія-каледж», больш за 1 тысячу школ з паглыбленым вывучэннем асобных прадметаў.

Для сельскай моладзі створаны пэўныя прэферэнцыі пры паступленні ў ВНУ, і гэта вельмі правільна. Але, як сведчыць яшчэ вывучэнне вопыт, гэтага не заўсёды хапае. Адзін наш выпускнік, які на міжнароднай алімпіядзе па біялогіі заваяваў сярэбраны медаль, паступіў у БДУ, але правучыўшыся там 8 месяцаў, вымушаны быў яго пакінуць. Прычына банальная — для таго, каб жыць і вучыцца ў сталіцы, патрэбныя грошы. Мы аказвалі падтрымку дзіцяці з малазабяспечанай сям'і, калі ён навучаўся ў нашай гімназіі, але далей яго сацыяльна не падтрымалі. І цяпер ён вымушаны працаваць механізатарам у сельскай гаспадарцы.

Яшчэ адна праблема, на якую звярнуў увагу Уладзімір Шыцько, актуальная для ўсіх устаноў адукацыі інтэрнатнага тыпу. Як выканаць натуральныя нормы і забяспечыць паўнавартаснае чатырохразовае харчаванне падлеткаў ва ўзросце 15—17 гадоў за 2790 рублёў у дзень? Апошні раз грашовыя нормы для ўстаноў адукацыі інтэрнатнага тыпу змяняліся ў студзені 2005 года! «Чаму мы не шкадуем грошы на харчаванне выхаванцаў вучылішчаў алімпійскага рэзерву? Няўжо толькі для фізічнай працы харчаванне мае значэнне, а для разумовай працы — гэта другасны фактар?» — прагучала рытарычнае пытанне.

Удзел студэнтаў у рэспубліканскім конкурсе навуковых работ:
2006 год — 3132 чалавекі
2005 год — 2840 чалавек
2004 год — 2288 чалавек
2003 год — 1753 чалавекі

Балючае пытанне для Беларусі — гэта пагроза «ўцечкі мазгоў», хоць і не заўсёды аб гэтай праблеме гавораць услых. Не сакрэт, што пераможцам міжнародных алімпіяд паступаюць заманлівыя прапановы атрымліваць адукацыю ў прэстыжных універсітэтах Еўропы і Амерыкі. Да таго ж вельмі актыўна праяўляюць сябе і расійскія ВНУ. Лужаснянскую гімназію агітатары наведваюць кожную вясну.

Педагогі гімназіі проста ў разгубленасці. Многія іх выпускнікі атрымліваюць адукацыю ў Санкт-Пецярбургу і Маскве. Зразумела, гэта прэстыжна. Але дзе, цікава, прадстаўнікі беларускіх ВНУ? Чаму яны пачынаюць працаваць з абітурыентамі толькі пасля падачы дакументаў у прыёмную камісію, а потым скардзяцца, што ў дзяцей знікае інтарэс да класічных факультэтаў універсітэтаў...

Дарэчы, многія расійскія ВНУ залічваюць без экзаменаў нашых пераможцаў абласных алімпіяд. У нас жа права на пазаконкурснае залічэнне маюць толькі пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд — гэта дзесьці 220 чалавек, што складае 0,5 працэнта ад агульнай колькасці паступіўшых. Міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў не лічыць сітуацыю з адтокам таленавітай моладзі крытычнай:

— У нас з Расійскай Федэрацыяй створана адзіная агульнаадукацыйная прастора. І калі беларусы едуць атрымліваць адукацыю ў расійскія ВНУ, асабліва такія, як Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт ці Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт, гэта дае магчымасць для наладжвання новых кантактаў, для развіцця навуковых школ і перайманне перадавога вопыту. Да таго ж у суседзяў наладжана падрыхтоўка па тых спецыяльнасцях, якіх пакуль няма ў беларускіх ВНУ. І мы нават свядома накіроўваем у Расію моладзь для навучання па вострадэфіцытных для нашай краіны спецыяльнасцях. На маю думку, адток маладых людзей за межы Беларусі мінімальны. Усё ж такі ўзровень нашай вышэйшай адукацыі ў Беларусі дастаткова высокі. Пры гэтым у сваёй краіне заўсёды адчуваеш сябе больш упэўнена. І гэта разумеюць і дзеці, і іх бацькі.

Дарэчы, сёння на разглядзе ў Савеце Міністраў знаходзіцца прапанова аб павелічэнні заробкаў для тых маладых спецыялістаў, якія ўключаны ў рэспубліканскі банк даных адоранай моладзі, на 15 працэнтаў. Ёсць надзея, што ўрад гэту прапанову падтрымае...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:

Банк даных адоранай моладзі:
2584 навучэнцы агульнаадукацыйных устаноў, гімназій і ліцэяў;
784 студэнты, магістранты і аспіранты;
1989 працуючых
Усяго 5857 чалавек.

З 1989 маладых людзей, звесткі аб якіх знаходзяцца ў банку адоранай моладзі, больш за 600 чалавек працуюць у навучальных (навуковых) установах, больш за 400 чалавек — ва ўстановах (на прадпрыемствах) дзяржаўнай формы ўласнасці і больш за 200 чалавек — ва ўстановах (на прадпрыемствах) прыватнай формы ўласнасці.

Шайбу, шайбу!

КЛЮШКІ — У ФІНАЛЬНЫ БОЙ

Паралельна з правядзеннем фінальнай серыі Адкрытага чэмпіянату Беларусі праходзяць і 11-я рэспубліканскія спаборніцтвы сярод дзяцей і падлеткаў па хакею «Залатая шайба» на прызы Прэзідэнта РБ, якія таксама набліжаюцца да сваёй кульмінацыі. Днямі ў Брэсце стартаваў фінал рэспубліканскага тура ў малодшай узроставай групе (ён праходзіць у горадзе над Бугам з 20 па 24 сакавіка), а 27—31 сакавіка пераможцы абласных спаборніцтваў у старэйшай узроставай групе разыграюць галоўны прыз у Магілёве.

Паводле інфармацыі Паўла Ягорава, намесніка загадчыка аддзела патрыятычнай, спартыўнай, культурна-масавай працы ЦК ГА БРСМ, пераможцамі абласных спаборніцтваў у малодшай узроставай групе сталі: «Алімпіец» (Брэст), «Прамень» (Аршанскі раён Віцебскай вобласці), «Арляня» (в. Орля Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці), «Юнацтва» (Салігорск Мінскай вобласці), «Тарнада» (Мінск), «Буравеснік» (Магілёў), «Вымпел» (Чыгуначны раён г. Гомеля). У старэйшай жа групе мацнейшымі дружынамі аказаліся: «Азяркі» (Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці), «Алімпіец» (Брэст), «Прамень» (Аршанскі раён Віцебскай вобласці), «Камунальнік» (Барысаў Мінскай вобласці), «Беркут» (Фрунзенскі раён г. Мінска), «Крыніца» (Магілёў), «Вымпел» (Чыгуначны раён г. Гомеля). Аднак у фінале рэспубліканскага тура акрамя сямі беларускіх удзельнікаў, у кожнай узроставай групе згуляюць госці з Расіі.

Удзельнікам спаборніцтваў накіраваў віншаванне кіраўнік беларускай дзяржавы, прэзідэнт НАК Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Ірына АНАТАВА.

ОФІС І ФІТНЭС — ПАНЯЦЦІ СУМЯШЧАЛЬНЫЯ

У свеце дзелавых касцюмаў і высокіх абцасаў заўсёды можна знайсці месца і час для спорту. Было б жаданне!

Зарадка на працоўным месцы — вось што выратуе нас ад дэпрэсіі, а цела — ад маларухомасці. Нялёгка, згадзіцеся, бывае прымусіць сябе зрабіць зарадку, праводзячы цэлы дзень за офісным сталом перад маніторам камп'ютара. І справа не толькі ў нашай ляноце: здаецца, вось толькі сабраўся зрабіць колькі прысяданняў ці іншых практыкаванняў, як тут жа спатрэбішся калегам па рабоце, начальству. І ўсё ж знайсці 15 хвілін на працягу 8-гадзіннага працоўнага дня можна кожнаму. Лепш зрабіць гэта апоўдні ці перад абедам (але не варта адразу пасля размінкі накіроўвацца ў сталовую).

Пачнём з паставы. Прыгожая пастава — гэта першы крок да ідэальнай знешнасці. Прамая спіна і распраўленыя плечы заўсёды дазволяць вам адчуваць сябе ўпэўнена і прымусяць навакольных глядзець на вас з павагай.

Працуючы седзячы, мы нахіляемся і знаходзімся ў такім становішчы шмат гадзін у дзень, часта без перапынку. Наша цела міжволі прымае такое становішча, і мы, самі таго не заўважаючы, горбімся.

Для прыгожай паставы і прафілактыкі сутуласці ёсць просты комплекс практыкаванняў. Для гэтага трэба знайсці ў офісе сцяну, не застаўленую мэбляй (падыдзе свабодная сцяна шафы памерам 2х2 м).

Практыкаванне першае.

Шчыльна прыхіліцеся да сцяны ўсім целам, прыцісніце да сцяны спіну, плечы, рукі далоні, ногі. Хвіліну пастойце ў такім становішчы і зрабіце 7 глыбокіх удыхаў-выдыхаў (удых цераз нос, выдых — цераз рот). Затым, не мяняючы становішча цела, зафіксуйце яго. З такой выпрамленай спінай-«сцяной» пахадзіце некалькі хвілін па пакоі.

Практыкаванне другое.

Зноў прыхініцеся да сцяны (ужо не так шчыльна) і, сагнуўшы нагу ў калене, зрабіце па 7 махаў кожнай нагой.

Практыкаванне трэцяе.

Няшчыльна прыхініцеся да сцяны і, сагнуўшы руку ў локці, зрабіце па 7 махаў кожнай рукой. Гэтае практыкаванне лёгка выконваецца ў любым адзенні, нават у абліпку.

Практыкаванне чацвёртае.

Цяпер выконвайце адначасова мах правай рукой і левай нагой — 7 разоў. Затым — наадварот: мах левай рукой і правай нагой, таксама 7 разоў.

Практыкаванне пятае.

7 глыбокіх удыхаў-выдыхаў з нахіленнямі цела ўперад і матляннем рук унізе.

Гэтыя практыкаванні дапамогуць захаваць выдатную паставу, прыгажосць, маладосць, вядома, цудоўны настрой.

Правілы офіснага фітнэсу:

- ніякіх інтэнсіўных практыкаванняў — толькі размінка (у душ вы ж трапіце няхутка!);
- ніякіх рэзкіх практыкаванняў і махаў з вялікай амплітудай (вы ж у бізнэс-адзенні).

Нават такая абмежаваная размінка прынясе нямала карысці. Для большай зручнасці ў гэтым выпадку не насіце адзенне ў абліпку і занадта цесную бялізну. Абутак падбірайце са зручным абцасам і калодкай — для таго, каб забяспечваўся нармальны кровазварот і не дэфармавалася ступня.

Для ног добра і простая нагрузка — хадзьба. З'явілася вольная хвілінка — устаньце з-за камп'ютара і пахадзіце па калідоры, лепш — хуткім крокам. Калі вам даводзіцца доўга сядзець на адным месцы — пастарайцеся перыядычна перамінацца з нагі на нагу. Пазбаўцеся ад нядобрай звычкі сядзець закінуўшы нагу на нагу. Пры гэтым не злоўжывайце кавай — кава расшырае сасуды.

Выкарыстоўвайце такія практыкаванні:

- Седзячы, «пабегайце» нагамі па падлозе.
- Пару хвілін пастукайце пяткамі па падлозе. Сэнс гэтага практыкавання ў тым, што вы разганяеце кроў і лімфу.
- Патрэніруйце пальцы ног — паспрабуйце падняць з іх дапамогай з падлогі дробныя прадметы — ручку ці аловак — шкарпэткі ці калготкі ў гэтым не перашкода.
- Пакатайце падэшвай нагі па падлозе які-небудзь цыліндрычны прадмет, напрыклад, тоўсты аловак.
- Зрабіце нагам невялікі масаж — лёгкімі пагладжваннямі, пачаўшы са ступні, паднімайцеся па іхрах да калена, затым — некалькі кругавых рухаў над каленам.

Існуюць практыкаванні для любых частак цела. Вось некалькі з іх:

- каб **не зацякала шыя** ад працяглага сядзення за камп'ютарам, устаньце і распраўце плечы, выцягніце шыю, а затым нахіліце яе ўправа і ўлева, выконвайце і кругавыя рухі;
- калі **стамляюцца кісці рук** ад доўгай работы на клавіятуры, трэба перыядычна імі ўстрахваць. Для ўмацавання мышцаў рук можна паадціскацца ад стала ці ад сцяны;
- для **ўмацавання прэса** неабходна сесці бокам на крэсла да спінкі і пападнімаць калені да ўзроўню грудзей. Спрошчаны варыянт — патрымаць выпрамленыя ногі, падняўшы іх пад вуглом 90 градусаў;
- для **паляпшэння работы сэрца** выкарыстоўвайце кожную вольную хвілінку, прайдзіцеся па кабінеце, па калідоры. І ўвогуле, не ўпускайце ніводнай магчымасці прайсціся лішні раз пешшу, не чакайце ліфта. Галоўнае, памятайце: усё трэба рабіць у спакойным рытме, нетаропка.

ФІТНЭС ДЛЯ МАЗГОЎ

Хто з нас не трапляў у такое становішча: трэба працаваць, спраў па горла, часу на ўсё не хапае, вы яўна не паспяваеце ўсё зрабіць і ўжо сталі паніковаць — як вам справіцца з такой сітуацыяй?

Стрэсы нельга «накопліваць» у сабе. Стрэсы робяць нас старымі раней часу, паскараюць развіццё цэлюліту, утварэнне маршчынак, а самае галоўнае — яны зніжаюць імунітэт з усімі выцякаючымі наступствамі. Стрэсы трэба ўмець знімаць правільна. Нельга знімаць стрэс перакурамі, пірожнымі, моцнай кавай. Пажадана прыняць некалькі заспакаяльных пілюль з мятай, можна з'есці крыху шакаладу, прычым не жаваць яго, а смактаць.

Эфектыўным метадам зняцця стрэсу ў любых вытворчых умовах з'яўляецца прыемная размінка на працоўным месцы — вось што выратуе ад наступстваў стрэсу.

Першае — **выпраміце спіну, распраўце плечы і ўцягніце жывот.** Стрэс, як правіла, адразу пагаршае нашу паставу, прымушае «абмякнуць».

Заплюшчыце вочы. Перастаньце думаць аб непрыемнай размове з начальствам ці саслужыўцамі, аб нервовым тэлефонным званку. Падумайце аб тым, як вы зараз выглядаеце, успомніце, што пасля стрэсу ўсё напісана на вашым твары. **Расслабце твар,** зніміце з яго напружанне. Пакладзіце рукі на лоб і крыху памасіруйце яго, лёгка папляскайце сябе па шчоках, скулах. Патрыце скроні. Паўсправы зроблена.

Далей **зрабіце некалькі глыбокіх удыхаў і выдыхаў,** паклаўшы рукі на калені.

Калі лягчэй не становіцца, ёсць яшчэ адзін народны сродак — паскачыце і памахайце рукамі і нагамі. Ну а калі зусім нядобра, існуе яшчэ адзін сродак — удар рабром далоні па цвёрдай паверхні. Згодна з легендай, гэта практыкаванне выкарыстоўвалі амазонкі — а ўжо яны ўмелі процістаяць стрэсам і ніколі не гублялі сіл і баявога духу.

Цяпер, калі вы супакоіліся, вярнуцца да работы з новымі адчуваннямі, добрым настроем і разумнымі думкамі. Вы ў выдатнай рабочай форме!

Анастасія ФАНДО.

РАЗМЯРКУЮЦЬ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Падрыхтоўчы этап трэба пачынаць як мінімум у першыя дні заняткаў выпускнога курса, — падтрымлівае пункт погляду калегі Ніна Міхайлаўна. — Гэта звязана з тым, што студэнту неабходна паспець атрымаць агульную інфармацыю, асэнсаваць і ацаніць, прадумаць усе магчымыя варыянты, вызначыць найбольш зручныя з іх, сфармуляваць дакладныя пытанні да кансультанта, атрымаць кваліфікаваны адказ і выбраць найбольш правільнае рашэнне. Згадзіцеся, на гэта спатрэбіцца нямала часу. А калі яшчэ і ўлічыць, што нярэдка кансультанту для адказу спатрэбіцца дадаткова даследаваць праблему з дапамогай зваротаў у адпаведныя інстанцыі...

НА ПЕРШАГА-ДРУГОГА РАЗЛІЧЫСЯ!

Важна наколькі правільна выпрацаваны механізм вызначэння чарговасці размеркавання выпускнікоў. Безумоўна, галоўную ролю адыгрывае паспяховасць студэнта. Але не меншае значэнне маюць асабістыя якасці, звязаныя са спецыфікай прафесіі. Гэта можа праверыць толькі вытворчая (педагагічная) практыка.

— Выдатна, калі ўстанова адукацыі ўлічвае вынікі праходжання вытворчай практыкі пры размеркаванні выпускніка. У гэтым выпадку, — упэўнены Раман Восіпавіч, — і адносіны студэнта да практыкі будуць абсалютна іншымі.

— Гэты фактар мэтазгодна ўлічваць пры вызначэнні чарговасці размеркавання, бо ў сучасных арганізацыях не хапае, як правіла, ініцыятыўных менеджараў, якія ўмеюць браць на сябе адказнасць за прынятыя рашэнні. Установы адукацыі маюць права ўлічваць і іншыя фактары.

Выпускнік, які размяркоўваецца ў ліку першых, безумоўна, мае перавагу ў выбары будучага месца працы. Асабліва хвалюе іншагародніх выпускнікоў колькасць заняў з населеных пунктаў, дзе пражываюць іх бацькі, бо прадастаўленне жылля маладым спецыялістам сёння з'яўляецца праблематычным. Не менш хвалюючы момант для выпускнікоў — пытанне наяўнасці заяў найманьлікаў сталіцы і абласных гарадоў. Важна, каб пры распрацоўцы механізма вызначэння чарговасці размеркавання і адпаведных лакальных нарматыўных актаў былі ўлічаны пажаданні прадстаўнічых органаў студэнтаў, у першую чаргу прафсаюзнай арганізацыі, бо размеркаванне напрамую звязана з працаўладкаваннем, умовамі працы, памерам аплаты і іншымі пытаннямі, якія традыцыйна цікавяць прафсаюзныя органы.

СЛОВА ВЫПУСКНІКУ!

— Два гады ў параўнанні з цэлым жыццём — невялікі тэрмін. А вопыт жа, паверце, яшчэ ніколі нікому не перашкодзіў, — супакойвае сябе Света. — Паступала па мэтаваму накіраванню. Тады не задумвалася аб будучым месцы працы: хацелася проста вучыцца ў сталіцы. Зараз толькі ўсвядоміла, што давядзецца, як мінімум, два гады прысвяціць роднаму раёну. Жах як не хочацца пакідаць Мінск.

Колькі людзей, столькі і думак. У мяне, напрыклад, ёсць знаёмы, які, у адрозненне ад Светы, марыць вярнуцца працаваць у раённую газету. Хоць, упэўнена, ён мае ўсе шанцы размеркавацца ў рэспубліканскае выданне.

Сёння стаўленне да дзяржаўнага абавязковага размеркавання неадназначнае. З аднаго боку, яно дае гарантыю пярвічнай занятасці маладых спецыялістаў, з іншага ж — у шэрагу выпадкаў ушчамляе выпускнікоў у правах на выбар першага рабочага месца. Толькі любога месца (у тым ліку і пад сонцам) можна пазбавіцца, калі не валодаць прафесійнымі якасцямі...

Надзея ДРЫЛА.

Сем Я

ШЛЮБ: «ДЗЕЦЯМ» УВАХОД ЗАБАРОНЕНЫ

Ёсць сярод нас такія, хто з лёгкасцю (быццам бы) пераскоквае з аднаго шлюбу ў другі і нават ставіць на гэтай «ніве» своеасаблівыя рэкорды. Чатыры, пяць, шэсць абяцанняў быць поруч да апошняга дня і кожны раз, як кажуць, «удала». А ёсць і такія, хто не зведаў за сваё жыццё сямейнай сувязі і ганарыцца (быццам бы) гэтым. А хто ў рэшце рэшт усё ж такі больш шчаслівы — халасцяк ці мнагажэнец, тая, што мяняла мужоў як пальчаткі ці старая дзева? Навошта чалавеку зарэгістраваныя адносіны, і ці варта захоўваць іх на ўсё жыццё? Вось пра што хочацца спытаць ва ўрача-псіхатэрапеўта Мінскага гарадскога псіхатэрапеўтычнага цэнтра Сяргея ЦВІРКО.

— Сям'я — гэта, безумоўна, падмурак грамадства. Яна выконвае не толькі сэксуальную і дзетародную функцыі, але і некаторыя іншыя, не менш важныя — культурную, сацыяльную, выхаваўчую...

— Выхаваўчая роля мае дачыненне да дзяцей?

— Сапраўды, не толькі да дзяцей. У шлюбе кожная індывідуальнасць працягвае развівацца. Увогуле шлюб можа адбыцца толькі паміж дарослымі асобамі, якія «выраслі» са сваёй сям'і і хочуць «расці» далей. Гэта азначае, што кожны чалавек павінен мець у шлюбе магчымасці для самастойнага развіцця, жыць свабодна — у межах закона. З другога боку, гаворка ідзе і пра ўзаемнае выхаванне, «рост» саюза, стварэнне «мы», што, як вы разумееце, больш, чым «я».

— Ад чаго залежыць, наколькі гарманічным будзе гэты саюз?

— Пытанне гарманічнага развіцця закладваецца ў біялагічных сем'ях мужа і жонкі. Таму можна гаварыць, што па сутнасці новы шлюб ствараюць бацькоўскія сем'і, а зусім не канкрэтныя асобы. Кожны з нас абавязкова пераносіць адносіны з біялагічнай сям'і ў сям'ю «па закліку сэрца». Сапраўдная гармонія — гэта ёсць саюз усіх вышэйпералічаных сем'яў.

— А з чаго звычайна пачынаюцца першыя праблемы?

— Першая стадыя любых узаемаадносінаў, напэўна, самая бязвоблачная. Адбываецца прыняцце адно аднаго, знаёмства з бацькамі, якія ў ідэале павінны разглядаць будучую жонку сына як дачку, будучага мужа дачкі як сына. Першыя праблемы маладой сям'і пачынаюцца з-за залежнасцяў, дакладней кажучы, з-за таго, што маці не ў стане разарваць «пупавіну» адносінаў са сваім сынам ці дачкой.

Самымі моцнымі сувязямі лічацца біяпсіхалагічныя, якраз такія, як паміж маці і дзіцем. Бацька па аб'ектыўных прычынах не ў стане перажыць падобныя адносіны. Устаноўлена, што ўнутрывантробная сувязь паміж маці і дзіцем захоўваецца на працягу ўсяго жыцця. Бацька ж пасля дзетараджэння застаецца на ўзбочыне, ён нібыта выканаў сваю функцыю. Праблема ў тым, што некаторым сем'ям удаецца яшчэ больш узмацніць, умацаваць гэту аддаленасць. Так, са з'яўленнем на свет першынца ў многіх маладых сем'ях абавязкі і клопат бацькі бяруць на сябе... цешчы, якія, як яны лічаць, проста дапамагаюць дачцэ, а на самай справе выціскаюць бацьку з сям'і. І не дзіўна, што мужчына знаходзіць сябе не ў шлюбе, а ў палітыцы, іншай жанчыне, любімым аўтамабілі і г.д. А што ім застаецца рабіць? Любімая цешча або свякроў не здолелі своечасова перарэзаць «пупавіну» адносінаў. Таму мы можам назіраць, напрыклад, сем'і, у якіх мужчыны называюць сваіх цешчаў матулямі. Бо тыя іх кормяць, падтрымліваюць матэрыяльна, бяруць на сябе яшчэ безліч абавязкаў цесця. Такі «сын» спыніўся ў сваім развіцці, ён не жадае жыць самастойна, браць на сябе абавязацельствы, адказваць за свае ўчынкі, ён проста ад адной матулі перайшоў да другой. Застаўся дзіцем.

— Няцяжка здагадацца, што аднойчы такі шлюб распадзецца. Тое, што не развіваецца, павінна адмерці...

— Так і ёсць. Кожны з нас будуе свой шлюб на падставе пэўных схем — біялагічных, культурных і г.д. Вось што, напрыклад, «прапагандуюць» зараз сродкі масавай інфармацыі? Яны паказваюць нам, як акцёры, палітыкі ідуць, што называюцца, уверх па службовай лесвіцы, дасягаюць вяршынь папулярнасці, матэрыяльнай забяспечанасці і пры гэтым мала хто захоўвае адзіны шлюб. Такая схема шкодзіць фарміраванню трывалай сям'і. Акрамя гэтага, мы не ў стане пазбавіцца таго, з чым выйшлі са сваёй біялагічнай сям'і. У яго ёсць сваё ўяўленне, аб тым, як павінна быць, у яе — сваё. «Мая мама так робіць...», «А мая мама...». Узнікае канфлікт. Па першым часе шлюбнага жыцця гэта нармальна. Бо калі чалавек разумее, што яго партнёр — асоба, што нельга пераносіць усё назапашанае ў біялагічнай сям'і ў сваю ўласную, то паступова пары ўдасца выпрацаваць свае рашэнні, яна навучыцца знаходзіць выйсце і ўзаемаразуменне. Для новаспечанай сям'і спачатку важна адысці ад бацькоўскага ўплыву, а вось пазней, калі гэта адбудзецца, як бы гэта дзіўна ні прагучала, прыняць, аб'яднаць вакол сябе матуль, бацькаў, бабуляў, дзядуляў. На вялікі жаль, некаторыя людзі да канца жыцця застаюцца дзецьмі, яны не хочуць працаваць над сабой, тым больш над інтарэсамі іншага чалавека. Скажам, сярод маіх пацыентаў ёсць 57-гадовае дзіця, якога прывяла на прыём матуля. Гэты чалавек не «вырас» і, канешне, ён не гатовы да шлюбу. Дарасласць праяўляецца ўсведамленнем таго, што ты — асоба, здольная прымаць сур'ёзныя рашэнні, да якіх адносіцца і рашэнне ўступіць у шлюб.

— Гэта так складана! Хочацца, каб цябе разумелі з паўслова, насілі на руках і нічога ад цябе не патрабавалі...

— Вось менавіта так і разважаюць «дзеці». Пражыць усё жыццё ў адным шлюбе, захаваць пачуцці — цеплыні, павагі — вельмі складана. Мы павінны зразумець, што для таго, каб стаць дарослым, неабходна мяняць не цешчу, не свякроў ці партнёра, а сябе. Толькі сябе. Тады вы будзеце расці як асоба.

— Вядома, што грамадзянскі шлюб, мякка кажучы, не лепшы варыянт з пункту гледжання юрыдычнай абароны дзяцей. А што можна сказаць пра адносіны пары, якая жыве без афіцыйнай рэгістрацыі?

